Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гада.

Неапынарытованыя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Замена адрасу: пімагародзія	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шапарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок шапарэлі пасярод тэксту	1 р. — к.
За радок шапарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сялянным на 50 проц. дарэмай.

Вялікі тэрмін бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	25 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрадметны і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх паштовых Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 231 (2419) Субота, 6-га кастрычніка 1928 г.

Усім акруговым выканаўчым камітэтам.

На працягу часу ад мінулых перавыбараў саветаў наша краіна пераступіла з адбудоўчага ў рэканструкцыйны перыяд сацыялістычнага будаўніцтва, праводзячы ў жыцьцё грандыёзныя задачы па індустрыялізацыі народнае гаспадаркі, калектывізацыі вёскі, павялічэньне абароназдольнасьці краіны, рацыяналізацыі, пашырэньню культуры, палепшаньню савецкага апарату і барацьбы з бюракратызмам праз разгортваньне савецкай дэмакратыі, узмацненьне масавай работы саветаў і выканкомаў, вылучэньне рабочых і сялян, значнае ўцягненьне ў працу саветаў працоўных нацменшасьцяй БССР, праз палепшаньне окамічнага і культурнага іх абслугоўваньня.

Мінулая перавыбарчая кампанія дала значныя станоўчыя палітычныя вынікі, галоўнымі з якіх зьяўляюцца: значны рост антыўнасьці ўсіх працоўных гораду і вёскі, пры найбольшым павялічэньні антыўнасьці і кіруючае ролі рабочае клясы; павялічэньне антыўнасьці жанчын, работніц і сялянак, больш шырокае ўцягненьне ў кампанію вясковае беднаты і ўзмацненьне яе арганізаванасьці, узмацненьне саюзу вясковай беднаты з серадняцтвам, якія далі рашучы адпор палітычным дамаганьням кулакіх і варожых савецкай уладзе элементаў.

Разам з гэтым у апошнюю перавыбарную кампанію былі адзначаны недахопы, як: зьніжэньне лічбы агульнага ўдзелу ў перавыбарах па сельскіх мясцовасьцях, зьмяншэньне колькасьці жанчын у выбарным складзе сельскіх органаў улады, на досыць вашчэ вытарчальнае ўцягненьне ў кампанію батрацтва і беднаты, няпоўнасьць справаздач і вельмі слабо разгорнутая справаздачнасьць паасобных дэпутатаў, амаль адсутнасьць оправаздач рэвізійных камісій у выніку іх слабай дзейнасьці, невыстарчальнае прыцягненьне да ўдзелу ў кампаніі і не абслугоўваньня мясцовых грамадзкіх арганізацый і ўстаноў і г. д. Урэшце, на выніку кампаніі адмоўна меў уплыў шэраг недахопаў арганізацыйнага характару (наўдалы выбар часу сходаў, дрэнны падбор памашканьняў, неоваечасовае абвяшчэньне і інш.). Усе гэтыя недахопы павінны быць рашуча зьнішчаны ў надыходзячую перавыбарчую кампанію.

Бягучая перавыбарчая кампанія павінна прайсьці, як генэральная праверка правільнага разьвязваньня чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва ўсімі органамі савецкае ўлады і паасобнымі іх працаўнікамі шляхам абгаварэньня справаздач саветаў і выканкомаў і вынікаў савецкага будаўніцтва.

Перавыбары гэтага году павінны папулярызаваць і ўнідрыць усьвядомасьць самых шырокіх працоўных мас разуменьне асноўных задач нашага гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Перавыбары павінны забясьпечыць: пасьпяховае ажыцьцяўленьне і правільнае пераламленьне гэтых задач у дзейнасьці адноўленых саветаў і выканкомаў на аснове поўнага вынарыстаньня апошнімі сваіх пашыраных правоў; узмацненьне іх уплыву на разьвіцьцё мясцовае прамысловасьці, гаспадарні і культурнага будаўніцтва, далейшае разгортваньне работы саветаў і выканкомаў праз ўцягненьне ўсяе масы членаў гэтых органаў і рабоча-сялянскага актыву ў штодзённую сваю дзейнасьць і залучэньне найбольш актыўных, клясава-вытрыманых і працаздольных рабочых і сялян на кіруючую савецкую работу.

Палітычным вынікам перавыбараў павінна зьявіцца далейшае павялічэньне палітычнай антыўнасьці рабочых і сялян: яшчэ большае ўзмацненьне пралетарскай дыктатуры і замацаваньне бяднацка-серадняцкага блёку на грунце рашучага адпору кулацтву і іншым варожым савецкай уладзе элементам гораду і вёскі.

Тая акалічнасьць, што ў гэтым годзе падрыхтоўка кампаніі распачата загадзя яшчэ больш павялічвае адказнасьць савецкіх органаў за поўнае выкарыстаньне маючыхся ў зьвязку са значнымі тэрмінамі падрыхтоўкі магчымасьцяй дасканалай прапрацоўкі ўсіх неабходных мерапрыемканьняў для забясьпячэньня посьпехаў бягучай кампаніі.

У мэтах правільнага і пасьпяховага ажыцьцяўленьня вышэй пералічаных задач, Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР лічыць неабходным наступнае:

1. Безадкладна разгарнуць работу па азнаямленьню шырокіх мас рабочых і сялян з асноўнымі задачамі чарговых перавыбараў і задачамі сацыялістычнага будаўніцтва наогул.

Разгарнуць шырокую разьяснальную работу па высьвятленьню працоўным інструкцыі аб выбарах у саветы,

Прыступ[illegible] распрацоўкі і ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў па аблугоўваньні оправаздач на перавыбарчай кампаніі сродкамі масавай агітацыі, як: друк, радыё, кіно, адозвы, плякаты і г. д.

2. Шляхам масавага абсьледаваньня спэцыяльнымі камісіямі ЦВК, АВК і РВК, пры ўдзеле мясцовай савецкай грамадзкасьці праверыць наколькі нізавыя саветы і выканкомы, іх камісіі і сэкцыі—на грунце пашыраных правоў выконвалі наказы выбаршчыкаў, а таксама дырэктывы зьездаў саветаў і вышэйшых органаў улады.

Разам з гэтым правесьці праверку складу саветаў і выканкомаў з пункту гледжаньня іх працаздольнасьці, усьведамленьня і правільнага праядзеньня імі ў жыцьцё галоўных задач сацыялістычнага будаўніцтва, якія стаяць перад савецкай уладай.

3. Побач з забясьпячэньнем поўнай і вычэрпваючай оправаздачнасьці сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў пад кутом погляду праверкі выкананьня наказаў, дадаткаў да іх і прапаноў выбаршчыкоў, разгарнуць максымальна шырокую оправаздачнасьць перад выбаршчыкамі райённых і акруговых выканаўчых камітэтаў, шляхам арганізацыі выездаў прадстаўнікоў гэтых органаў на рабочыя і сялянскія сходы.

Зрабіць захады да поўнае справаздачнасьці ўсіе масы дэпутатаў гарсаветаў і членаў сельскіх, местачковых саветаў на сваіх выбарчых вучастках.

Таксама прыцягнуць да оправаздачнасьці мясцовыя органы і ўстановы, якія абслугоўваюць найбольш важныя жыцьцёвыя патрэбы выбаршчыкаў (школы, лясьніцтва, медпункты, хаты-чытальні і г. д.).

Па справаздачах разгарнуць шырокую крытыку недахопаў у работе ўсіх савецкіх органаў рабоча-сялянскімі масамі, дабіваючыся дзелавой ацэнкі, як дзейнасьці органаў улады ў цэлым, так і паасобных іх работнікаў.

4. Катэгарычна паставіць пытаньне, каб усе рэвізійныя камісіі сельскіх і местачковых саветаў адлічваліся наравне з сваімі саветамі.

Для гэтага ўсім рэвізійным камісіям праравізаваць адпаведныя саветы і выканкомы самым дасканалым чынам, асабліва зьвяртаючы ўвагу на правільнасьць скарыстаньня сродкаў, сабраных па самаабкладаньню і падрыхтаваць падрабязговыя дзелавыя оправаздачы.

5. Прыцягнуць да антыўнага ўдзелу і дапамогі ў перавыбарах усе мясцовыя грамадзкія арганізацыі і ўстановы; дабіцца поўнага і актыўнага ўдзелу ў выбарчай кампаніі рабочых, батракоў і бяднака-серадняцкага сялянства. У ходзе кампаніі выяўляць актыўных выбаршчыкаў з рабочых, батрацкіх і бяднацка-серадняцкіх пластоў, з мэтай падбору кадраў выбарнага складу саветаў і выканкомаў. Для гэтага шырока скарыстаць і папулярызаваць рашэньне Прэзыдыуму ЦВК аб павялічэньні норм прадстаўніцтва ў сельскіх і местачковых саветы да аднаго дэпутата на сто чалавек насельніцтва і вызначэньні колькасьці членаў савету ў ліку ня менш 20-ці і ня больш 50-ці дэпутатаў.

Асаблівую ўвагу зьвярнуць на мерапрыемканьні па забясьпячэньню далейшага росту палітычнай антыўнасьці і ролі ў выбарных савецкіх органах жанчын-работніц і сялянак, а таксама сельска-гаспадарчых рабочых, батрацтва, рабочай і бяднацка-серадняцкай моладзі.

Адначасна правесьці вылучэньне на больш адказную кіруючую работу ў саветах і выканаўчых камітэтах дэпутатаў і дэпутатак з рабочых, батракоў, бяднякоў і актыўна вызіўшых сябе на практычнай савецкай працы сераднякоў.

6. Лічыць неабходным прыцягненьне самых шырокіх колаў савецкай грамадзкасьці, прафэсыянальных, камсамольскіх і іншых арганізацый да ўдзелу ў справе перагляду сьпісаў выбаршчыкаў і пазбаўленых выбарчага права ў дапамогу выбарчым камісіям, саветам і выканкомам пры правядзеньні гэтай работы, маючай вялізарнае палітычнае значэньне.

Пры пераглядзе сьпісаў не дапускаць ніякіх адступленьняў ад інструкцыі аб выбарах у саветы,

7. Ва ўсёй падрыхтоўчай рабоце да перавыбараў, а таксама пры правядзеньні справаздач і перавыбараў саветаў і выканкомаў, для дальнейшага ўцягненьня працоўных нацменшасьцяй у выбарныя савецкіх органы, а таксама для павялічэньня іх актыўнасьці ў гэтых органах, забясьпечыць абслугоўваньне нацыянальных меншасьцяй выданьнем на нацыянальных мовах адпаведнай літаратуры, позваў, абслугоўваньне ўсіх выбарных вучастнаў, у якіх большасьць выбаршчыкаў складаецца з нацменшасьцяй, на іх роднай мове.

8. Лічыць неабходным, каб усе члены ЦВК, АВК і РВК, працуючыя на мясцох, прынялі самы актыўны ўдзел у справаздачна перавыбарчай кампаніі і ўсямерна дапамагалі мясцовым органам у яе правядзеньні.

9. Забясьпечыць арганізацыйна-тэхнічнае абслугоўваньне кампаніі, вылучыўшы належныя кадры працаўнікоў і прыцягнуўшы для гэтага ў вёсцы, дзе асабліва мала тэхнічных сіл, на дапамогу вясковую інтэлігенцыю, камсамол і іншыя арганізацыі.

10. Акруговым і райённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам зрабіць захады для надрукаваньня наротніх справаздач аб сваёй дзейнасьці, каб выбаршчыкі і радавыя дэпутаты маглі з імі своечасна азнаёміцца і падрыхтавацца да оправаздач.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

1 кастрычніка 1928 г.
гор. Менск.

Рэформы ў Аўганістане.

ЧАДРА САРВАНА.—СУПОЛЬНАЕ НАВУЧАНЬНЕ ДЗЯЎЧАТ І ХЛОПЦАЎ.

КАБУЛ, 3-X. Сёньня ў падышаха адбыўся трэці вялікі сход („дурбар"), на якім падышах падрабязна выказаў свой погляд, ці насіць жанчынам чадры, ці не. Падышах зазначыў, што зьнішчэньне гэтага звычаю не супярэчыць ісламу. Адкрыўшы потым твар сваёй жонкі, якая знаходзілася на сходзе, падышах прапанаваў прысутным зрабіць так, як ён, г. зн. даць жонкам магчымасьць хадзіць з адкрытым тварам. Прапанова падышаха была адназгодна ўхвалена.

Спыніўшыся далей на пытаньнях асьветы, падышах паведаміў, што ўводзіцца супольнае навучаньне дзяўчатак і хлопчыкаў да 11 гадоў. Апроч таго, будуць адчынены пачатковыя школы тыпу першае ступені з 5-гадовым навучаньнем. Такія школы будуць адчынены ў самых буйных гарадох. Будуць таксама адчынены сярэднія і розныя спэцыяльныя школы.

З іншых шматлікіх рэформ, намечаных падышахам, самымі буйнымі зьяўляюцца такія: адчыненьне дзяржаўнага банку, значнае зьмяншэньне прывозных мытаў на нафтапрадукты і на прылады спорту. Намечаны яшчэ некаторыя мерапрыемствы, напрыклад, пашырэньне жаночых больніц, рэарганізацыя тайнае паліцыі, арганізацыя пэнсіённага фонду для служачых, забарона чынам міністэрства замежных спраў і вайсковага міністэрства браць шлюб з чужаземцамі і г. д.

Рабочыя б'юць па панцырнай палітыцы Мюльлера.

БЭРЛІН, 3-X. Мітынгі, якія склікаюцца агульна-нямецкім камітэтам падрыхтоўкі ўсенароднага галасаваньня па пытаньні аб пабудове панцырнага крэйсэра, прыцягваюць шмат удзельнікаў.

2-га кастрычніка ў Бэрліне адбылося 19 такіх сходаў. Ухвалены рэзалюцыі з патрабаваньнем усенароднага галасаваньня. Апроч таго, адбылася канфэрэнцыя бэрлінскіх фабрычна-заводзкіх камітэтаў. Выступалі дэпутат прускага ляндтагу камуніст Шульц і стары лідэр незалежнае сацыялістычнае партыі Ледэбур.

Чырвоны саюз франтавікоў заклікае ўсіх сваіх сяброў узмацніць агітацыю за ўсенароднае галасаваньне.

СЛАУНЫ РЭЙС „КРАСІНА" СКОНЧАН.

Учора працоўны Ленінград сустракаў кагорту герояў экспэдыцыі.

ПАДЫХОД ЛЁДАКОЛУ ДА ЛЕНІНГРАДУ.

ЛЁДАКОЛ «ПУРГА», 5-X. А паўдні ў адкрытым моры грукатам гарматных салютаў быў спатканы «Красін». Музыка іграе «Інтэрнацыянал». Магутнае «ура» гучыць па суднах. Гідрасамалёты і дывізіён эсьмінцаў экскартуе «Красіна» на шляху ў Ленінград.

Лёдакол „Красін".

МАСКВА, 5-X. У Ленінград вароча́ецца пасьля амаль што чатырохмесячнага нябывалага ў гісторыі мараходзтва канцавоснага паходу «Красін».

„Красін" пабудован у 1916 г. у Англіі на вэрфі Армстронга. Водазьмяшчэньне—11000 тон. Мае 3 машыны магутнасьцю ў 10500 конскіх сіл. Хуткасьць—12-14 вузлоў. Асабовы склад лёдаколу 136 чалавек.

„Красін"—самы магутны лёдакол у сьвеце. З 1917 да 1920 г. знаходзіўся ў Англіі (быў выведзены туды ў часе інтэрвэнцыі). У 1920 г. «Красін» быў зьвернут у Ленінградзкі порт і з таго часу нераз удзельнічаў у лёдакольных кампаніях Ленінградзкага порту.

Красінцы прыедуць у Маскву.

МАСКВА, 5-X. У нядзелю 7-га кастрычніка, на Кастрычнікаўскім вакзале адбудзецца ўрачыстае спатканьне красінцаў, у якім возьмуць удзел актыў ТДА-Авіяхіму, дэлегацыі ад рабочых маскоўскіх заводаў і фабрык, прэзыдыум ТДА-Авіяхіму і інш.

Вітань „Красіну" ад НК Гандлю СССР.

МАСКВА, 4-X. Наркамгандлю СССР т. Мікаян выдаў, у зьвязку з зваротам «Красіна» ў Ленінград, загад па камісарыяце, у якім падагульваюцца вынікі 3-хмесячнай працы «Красіна».

Ад імя НК Гандлю СССР т. Мікаян вітае шчаслівы зварот «Красіна» з адважнага паходу і беззаганнае геройства матросаў і каманднага складу, якія пакрылі сябе славаю герояў. Загад канчаецца наступнымі словамі: «Нахай жыве гонар Савецкага гандлёвага флету—лёдакол «Красін» і яго каманда».

Працоўны ўдзельнікі экспэдыцыі на спатканьні красінцаў.

МАСКВА. Радыё-аматар Шмідт з селішча Вазьнясеньня-Бохмы, які першым прыняў пазыўныя сыгналы аб дапамозе дыржаблю «Італія», запрошан таварыствам прыняцеляў радыё ў Маскву да дню прыезду красінцаў.

У Маскву запрошаны таксама лётчык Сяргеяў і борт-мэханік Кяткоўскі, якія бралі ўдзел у паходзе „Малыгіна".

Іх імёнамі ганарыцца ўвесь СССР.

Праф. Самайловіч.

Начальнік экспэдыцыі «Красіна» прафэсар Самайловіч нарадзіўся ў 1881 годзе ў Азове, скончыў горную акадэмію ў Фрэйбэрзе (Нямеччына), вярнуўся ў 1904 годзе ў Расею. Удзельнічаў у рэвалюцыйным руху, нераз сядзеў у астрозе, потым быў высланы з Растова ў Архангельскую губерню; адтуль уцёк у Пецярбург і ўвайшоў у ваенную арганізацыю бальшавікоў, дзе жыў нелегальна два гады. Зноў высланы у 1908 годзе ў Архангельскую губ. на тры гады.

У 1911 годзе ўпяршыню ўдзельнічаў у экспэдыцыі на Шпіцбэрген, дзе разам з Русанавым выкрыў месторады каменнага вугалю ў Айс Фіёрдзе. У 1918 годзе заснаваў камісію па вывучэньні Поўначы, рэарганізаваную ў 1924 годзе ў інстытут па вывучэньні Поўначы, дырэктарам якога зьяўляецца і зараз.

З 1911 да 1927 г. кіраваў шасьцю экспэдыцыямі на Шпіцбэрген. Зьяўляецца правадзейным членам стаае паўночнае камісіі пры Акадэміі Навук СССР, членам дзяржаўнага расейскага геаграфічнага таварыства і членам прэзыдыуму Міжнароднага Таварыства па вывучэньні Арктыкі пры дапамозе паветранага карабля Мае друкаваньня працы на расейскай, нямецкай і ангельскай мовах.

Лётчык Чухноўскі.

Лётчык Чухноўскі нарадзіўся ў 1898 годзе. Скончыўшы Гатчынскае раальнае вучылішча, ён паступіў дабрахвотнікам у вайсковы марскі корпус. У 1917 годзе супольна з ротай марскога корпусу выступіў проці часовага ўраду і перайшоў на службу да савецкае улады. У тым-жа годзе скончыў школу марскоя авіяцыі. У 1918 г. назначан начальнікам Араніенбаумскага марскога паветранага дывізіёну і ў ліпені з посьпехам скончыў школу лётчыкаў паветранага бою.

У 1919 годзе на фронце грамадзянскае вайны працаваў лётчыкам у гідраатрадзе Каспійскае Вайсковае Флётыліі. У 1920 годзе назначан камандзірам першага гідраатраду Вайсковае Волскае Флётыліі і ў тым ма годзе назначан начальнікам марское авіяцыі Каспійскага мора. У часе грамадзянскае вайны на Азоўскім моры працаваў лётчыкам, а таксама камандзірам гідраатраду паветранага дывізіёну Азоўскага мора. Пасьля грамадзянскае вайны ўзяўся за вучобу і ў 1923 годзе залічыўся слухачом марское акадэміі ў Ленінградзе, у 1924 і 1925 годзе па камандыроўцы акадэміі ўдзельнічаў у паўночнай гідраграфічнай навуковай экспэдыцыі, наведаў Новую Зямлю. У 1927 г. Чухноўскі служыў у адной з чорнаморскіх вайсковых эскадрыльяў.

Камандзір Эгті.

Камандзір „Красіна" Эгті нарадзіўся ў Ліфляндзкай губерні ў 1893 годзе ў сялянскай сям'і. Скончыў сельскую школу і пачатковае вучылішча ў Арэнсбурзе. У 1907 годзе паступіў у арэнбурскую падрыхтоўчую мараходную школу. Увясну ў 1908 годзе паступіў на парусное судно матросам, потым вярнуўся ў вучылішча. Увясну 1911 г. скончыў падрыхтоўчую школу і ў тым-жа годзе паступіў на парусное судно, потым плаваў матросам на параходзе. У 1915 годзе вытрымаў экзамен на штурмана і быў мабілізаваны на паўночны фронт. У 1917 г. адкамандыраван пад загад галоўнага марскога штабу ў Ленінград, а адтуль—у Архангельскі флёт. У 1920 г. брэў удзел у Карокай экспэдыцыі ў якасьці флагманскага штурмана. Потым пераведзен другім памоцнікам камандзіра лёдаколу „Седаў". У 1920 г. назначан старэйшым памоцнікам камандзіра лёдаколу «Ленін», а потым на тую-ж пасаду на «Красін». У ліпені 1926 г. назначан камандзірам лёдаколу «Ленін», а 13-га чэрвеня 1928 г.—камандзірам «Красіна» ў часе паходу на падачы дапамогі экспэдыцыі Нобіле.

Праз калючыя перагародкі.

МАСКВА. «Правда» ў перадавіцы—„Сквозь колючую изгородь"—піша:

6-ты кангрэс Камінтэрну ацаніў першыя пасьляваеннага сусьветнага разьвіцьця, у які мы ўвайшлі, як трэці новы перыяд, які характарызуецца абвастрэньнем клясавае барацьбы і выклікае новы прыліў рэвалюцыйнае хвалі і палявеньне пралетарыяту.

Не зважаючы на ўрачыста абвешчаны і шырока рэклямаваны «мір у прамысловасьці», клясавая барацьба ўсё больш узьнімаецца. Штодня надыходзяць весткі, што расьце забастовачная хваля ў Нямеччыне, Францыі, Польшчы, Чэхаславакіі, Злучаных-Штатах і далёкай Аўстраліі.

Пазіцыя рэфармістаў выкрышталізавалася поўнасьцю. Ход падзей усё мацней дыктуе найбольш рашучае завастрыць рэвалюцыйную барацьбу в контр-рэвалюцыйным рэфармізмам.

Бірмінгамскі зьезд ангельскае «рабочае» партыі зьявіўся яскравым прадоўжаньнем кангрэсу трэд'юніёнаў у Свансі. Аднолькавасьць праграм рабочае і лібэральнае партыі пачала набываць амаль-што матэматычны характар. І паколькі ў рабочай партыі «добрыя» міліянэры (тыпу Мосьлі) пачалі жыць разам з падманутымі пралетарыямі, дык пан Ленсбэры меў падставу заявіць, што ангельская рабочая партыя зьяўляецца „не клясавай партыяй". Аднак, пан Ленсбэры мае рацыю толькі аднабакова: рабочая партыя даўно пакінула быць клясавай пралетарскай партыяй, але затое яна стала клясавай буржуазна-«рабочай» партыяй. Пужлівая палавінчатая пазіцыя, занятая апазіцыяй зьезду, зразумела, не ўвядзе нікога ў абман. І калі Броўн мог кінуць крылатыя словы, што правадыры рабочае партыі зьяўляюцца толькі «каретаю хуткае дапамогі для капіталізму», дык кожны ангельскі рабочы мае права запытаць Броўна: чаму-ж ён сам ня спыняе служыць малодшым фурманом гэтае кареты?

У капіталістычнай гіндэнбургаўскай Нямеччыне клясавая барацьба ломіць калючую перагародку, якая ўважліва будуецца рэфармістамі.

Пралетарскія масы, рабочыя і работніцы, на чале якіх знаходзіцца нямецкая кампартыя, ня спыняюць энергічнае барацьбы проці «панцырнае» палітыкі сацыял-дэмакратыі. Бастуюць проці жаданьня і наперакор здрадніцтву рэфармістаў 50 тысяч рабочых-будаўнікоў суднаў. Сацыял-рэфармісты робяць усё ад іх залежнае, каб сарваць барацьбу. Буржуазея гаворыць проста, што ў справе штрэйхбрахерства яна трымае стаўку на рэфармістаў.

У Францыі разрастаецца стачачны рух сярод тэкстыльшчыкаў. Настрой рабочых-стачачнікаў бадзёры.

У Польшчы сацыял-фашысты сарвалі было стачку лёдзінскіх рабочых, але водлуг апошніх вестак, яна выбухае зноў: забаставала 40 тысяч адважных пралетарыяў.

Барацьба адбываецца і па іншых вучастках капіталістычнага фронту. Пра яе надыходзяць весткі і са Злучаных Штатаў і з Аўстраліі. Усё гэта сьведчыць, што рабочы рух магутна прарываецца наперад, што пралетарыят ня толькі можа перайсьці, але і пераходзіць, пад разгорнутымі рэвалюцыйнымі сьцягамі, у контр-наступ проці капіталістаў, проці буржуазнае дзяржавы, проці контр-рэвалюцыйнага сацыял-рэфармізму.

„РЭАРГАНІЗАЦЫЯ" НАНКІНСКАГА ЎРАДУ.

МАСЫ ЦАЛКАМ ПАПАДАЮЦЬ У «АПЕКУ» ГАМІНДАНАЎСКІМ ГЕНЭРАЛАМ

ШАНХАЙ, 5-X. Палітычная рада нанкінскага ўраду ўхваліла законапраэкт аб рэарганізацыі нацыянальнага (нанкінскага) ўраду. Выканком Гаміндану зацьвердзіў законапраэкт і адначасна прыняў прынцыпы, «якімі належыць кіравацца ў сучасны пэрыяд палітычнае апекі над кітайскім народам да ўвядзеньня канстытуцыі; апошняя будзе ўведзена, як стане магчыма ажыцьцёвіць дэмакратызм». Згодна гэтых прынцыпаў нацыянальны збор Кітаю часова замяняецца нацыянальным зьездам дэлегатаў гаміндаўскіх арганізацый. Між зьездамі Гаміндану палітычная ўлада знаходзіцца ў руках выканаўчага камітэту Гаміндану. На працягу пэрыяду «палітычнае апекі» кітайскі народ павінен «паступова навучацца карыстаньню выбарчым правам і іншымі прынцыпамі дэмакратыі, каб гэткім парадкам падрыхтавацьі пераход да арганізацыі канстытуцыйнага ўраду». Пяць асноўных органаў ураду—адміністрацыйная, заканадаўчая, юрыдычная, экзаменацыйная рады і рада дзяржаўнага кантролю падначальваюцца новазаснаванай урадавай радзе нацыянальнага (нанкінскага) ўраду, у руках якое згуртоўваецца ўся ўлада. Вышэйшая ўлада застаецца за выканкомам Гаміндану.

Масы разуверыліся ў Гаміндане.

ШАНХАЙ, 4-X. Прафсаюзы тытунёўцаў, друкароў, прадзільшыкаў, маракоў і служачых абяцалі падтрымліваць бастуючых у Шанхаі паштавікоў.

Памяшканьне саюзу паштавікоў зачынена ўладаю. Аднак, саюз і стачачны камітэт ня спыняюць дзейнасьці. У Нанкіне паштавікі падалі патрабаваньні адміністрацыі, дамагаючыся атрымаць адказ на працягу 3-х дзён.

ЦК Гаміндану даручыў мясцоваму аддзелу Гаміндану ўжыць захады, каб спыніць забастоўку ў Шанхаі.

Барацьба новае Антанты за Нямеччыну.

УСЕ СРОДКІ АНГЛА - ФРАНЦУСКАЕ ДЫПЛЁМАТЫІ НАКІРАВАНЫ НА ЎЦЯГНЕНЬНЕ НЯМЕЧЧЫНЫ Ў АНТЫСАВЕЦКІ ФРОНТ.

ПАРЫЖ, 4-X. Лёндзанскія карэспандэнты парыскіх газэт настойна падкрэсьліваюць патугі францускага ўраду дамагчыся згоды Англіі агаласіць угавор Агенцтва Гаваса паведамляе, што перамовы в Лёндзане адбываюцца ў прыяцельскай атмасфэры, але час агаласіньня згоды яшчэ не ўстаноўлен.

Наконт надыходзячых франка-нямецкіх перамаў, у новых варунках, якія ўтварыліся разьвіцьцём англа-францускага супрацоўніцтва, «Юманітэ» піша: «Перад намі разгортваюцца вынікі палітыкі, фармуляванае ў Жэневе Брыянам пры падтрымцы Англіі. Канчатковая мэта Англіі ў тым, каб ўцягнуць Нямеччыну ў адзіны фронт, заснаваны англа-францускаю Антантаю проці Злучаных Штатаў і, асабліва, проці Савецкага Саюзу. У бліжэйшыя дні мы будзем сьведкамі, як, імкнучыся прыцягнуць Нямеччыну да ўдзелу ў крыжавым паходзе проці СССР, фран цускі імпэрыялізм узмоцніць свой нажым на Бэрлін. Такую магчымасьць дадуць надыходзячыя перамовы.

Лільская стачка абяртаецца ва ўсеагульную.

ПАРЫЖ, 4-X. „Юманітэ" паведамляе, што да лільскае забастоўкі далучаюцца ўсё новыя фабрыкі. У Туркуэне і Рубэ, пасьля выступленьня дзеячоў унітарных саюзаў, ухвалена абвясьціць усеагульную забастоўку тэкстыльшчыкаў 5-га кастрычніка. У стачачны фонд сабрана 88 тысяч франкаў.

БЭНЕШ АБЯЦАЕ ЭКАНАМІЧНЫЯ ПЕРАМОВЫ З СССР.

ПРАГА, 4-X. Чэхаславацкае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што міністр замежных спраў Бэнеш выступіў на аб'яднаным пасяджэньні парляманцкае і сэнацкае камісіі па замежных справах в прамоваю аб замежнай палітыцы.

Наконт адносін да СССР Бэнеш заявіў: «Некаторыя ўрадавыя ўстановы зьбіраюць у сучасны момант матар'ялы для эканамічных перамоў з СССР, якія, як я спадзяюся, хутка распачнуцца».

Міжнародная эканом-гаварыльня.

ПРАГА, 4-X. У Празе адчынілася міжнародная эканамічная канфэрэнцыя, скліканая міжнародным саюзам „таварыстваў прыяцеляў Лігі Нацый".

ПРАЖКТЫ ЗЬМЕНЫ ДЗЯРЖАЎНАГА ЛАДУ У ПОЛЬШЧЫ*).

Як бачым, кіруючаю думкаю п. Студніцкага зьяўляецца недапушчэньне перавагі «антыдзяржаўных» элемэнтаў ні ў адной з сямі частак Польшчы. П. Студніцкі баіцца «крамолы» і ён хоча яе прыдушыць паліцэйска-адміністрацыйным спосабам—сілаю. Расшарпаць на дробныя кавалкі беларускае і украінскае цела, і так ужо падзеленае на дзьве часткі, для п. Студніцкага зьяўляецца ня толькі магчымым, але і патрэбным. Дзіўная рэч, што падобныя праэкты выходзяць цяпер з галавы заўзятага польскага незалежніка, які патраціў у свой час шмат сіл, каб разбудзіць сярод польскага грамадзянства імкненьне да незалежнасьці і да аб'яднаньня гэтага грамадзянства, раскіданага па трох дзяржавах, у адзін дзяржаўны арганізм.

Зразумела, што ў такім сваім відзе праэкт п. Студніцкага зьяўляецца зусім няжыцьцёвым.

П. Студніцкі спасылаецца ў сваіх разважаньнях на фактары эканамічныя, нацыянальна-польскія і геаграфічныя. Але ў той самі час ён забывае аб гістарычным фактары: аб зусім паасобным разьвіцьці пэўных абшараў сучаснай Польшчы, з выразнай уласнай фізыяноміяй нацыянальнага, культурнага і гаспадарчага жыцьця. Віленшчына, Наваградчына, Палесьсе, Валынь, Усходняя Галіцыя—гэта зусім што іншае, чым этнаграфічная Польшча. Калі п. Студніцкі «забывае» аб гэтым, дык забывае ўмысна. Ход думак гэтага стрэленага палітычнага верабʼя мы добра разумеем. П. Студніцкі бачыць, што пры сучасным цэнтралістычна-бюракратычным сваім укладзе, пры сучасным прыгнечаным палажэньні польскіх нацменшасьцяў польскі дзяржаўны арганізм моцна хварэе і амаль не канае.

*) Гл. „Сав. Бел." № 230.

«Будучыня ўсходу Эўропы — кажа ён—пойдзе ў сваім разьвіцьці па лініі фэдэрацыйных дзяржаўных саюзаў вольных народаў. Хто ў Польшчы змагаецца за канцэптыю нацыянальнай дзяржавы, той нар жае дзяржаву на цяжкую барацьбу ў будучыні з немагчымым прадбачыць вынікам, або на граніцы Польшчы ў рамках этнаграфічных. Абедзьве альтэрнатывы нездавальняючыя.

Адвечнае змаганьне з-за палітычнага кіраўніцтва і творчай культурнай ролі на ўсходзе Эўропы трывае і будзе трываць, пакуль шалька не пераважыць на адзін бок. Хто з гэтых двух партнёраў здолее стварыць новую панадзяржаўную дзяржаўную ідэю, той зьбярэ вакол сябе імкненьні народаў, аддзяляючых нас ад сапраўднай Расеі і пераважыць шальку на свой бок. Вялічча, паважаньне і значэньне Польшчы знаходзіцца там, дзе пачнецца перамога гэтай новай яе будучай дзяржаўнай ідэі.

Тэндэнцыі п. Ул. Студніцкага, якія выглядаюць з яго праэкту і істотай якіх зьяўляецца жаданьне, каб Польшча праглынула каналкі нацыянальных арганізмаў, якія ў сваёй большасьці засталіся ў нашага сучаснага праціўніка,—не забясьпечваюць нас ад яго агрэсыўнасьці, а адначасова скіроўваюць у яго бок сымпатыі і надзеі тых, хто сваёй нацыянальнай адасобнасьцю і неадлучным ад яе асьпірацыем застануцца вернымі.

Абапёртая на такіх прадпасылках дэцэнтралізацыя Польшчы не зьяўляецца крокам наперад. Вынікам яе будзе хутчэй узмацненьне барацьбы і нацыяналістычных антаганізмаў, дзеля таго, што яны знойдуць для сябе новыя сродкі і новыя аказіі. Толькі такая дэцэнтралізацыя можа прынесьці карысьць дзяржаве, якая, здавальняючы інтарэсы паасобных абшараў дзяржавы, задаволіць у патрэбнай меры вымаганьні нацыянальных груп, якія на гэтых абшарах жывуць, і канструкцыйнай палітыкай злучэньня іх жаданьняў з дзяржаўнай ідэяй створаць з часам асновы для рэалізацыі фэдэрацыйнай канцэптыі—гэтага ключа да канчатковай перамогі ў нашым гістарычным змаганьні з Расеяй».

Як бачым, п. Тэсьціс пагаварыў шмат цікавых наогул рэчаў, і в некаторымі з іх мы згаджаемся. Напрыклад, ён зусім слушна і вельмі трапна падмеціў слабыя бакі сыстэмы падзелу Польшчы на штучна выкраеныя тэрыторыі. Зусім таксама слушна ён выставіў другую сыстэму вырашэньня тэрытарыяльна-нацыянальных пытаньняў—гэта фэдэрацыйны саюз вольных народаў.

Але калі п. Тэсьціс пачынае гаварыць аб змаганьні з-за ўсходу Эўропы «двух партнёраў», г. ё. Расеі і Польшчы, дык нам шмат што станові

У Саюзе ССР.

ПРАЦЭС КУБАНСКІХ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЯНЭРАЎ.

РАСТОЎ-ДОН, 4-X. Учора ў краявым судзе распачаўся разгляд справы контр-рэвалюцыйнае групы студэнтаў Кубанскага сельска-гаспадарчага інстытуту. Падсудныя ў сваіх паказаньнях даремна хочуць абмаляваць перад судом сваю арганізацыю, як няшкодны гурток самаадукацыі. Аднак, падсудныя прызнаюцца ў выпуску лістовак, у якіх знаходзіла месца ўсё, пачынаючы ад процісавецкае дэмагогіі ў духу апазіцыі і канчаючы непасрэднымі заклікамі ўзяцца за зброю і выступіць проці савецкае ўлады. Кансьпірацыя гуртка ахоўвалася пад пагрозаю фізычнага зьнішчэньня ня толькі кожнага, хто паведаміць пра існаваньне гуртка, але і кожнага, выбыўшага з яго складу. Такому фізычна-зьнішчэньню падпала Зяноўя Крылова, скінутая са зьвязанымі рукамі ў Кубань з мосту і перад гэтым скалечаная да поўсьмерці.

Контр-рэвалюцыйная група была адарванаю ад усіх гушчаў жыхарства і варылася ва ўласным лёку. Удзельнікі групы нават баяліся паказваць лістоўкі самым блізкім сваім сваяком. Лістоўкі яны маглі раскідаць толькі ўночы.

КАЛЯНДАРНЫ ПЛЯН РОЗЫГРЫШУ ПАЗЫК НА 1928-29 г.

МАСКВА, 4-X. Наркамфін СССР распрацаваў каляндарны плян тыражоў выйгрышаў на 1928-29 г. Адбудзецца 22 тыражы выйгрышаў, ня лічачы тыражоў пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі, якія адбываюцца зараз у розных пунктах СССР.

Па першай пазыцы індустрыялізацыі будзе праведзена 4 тыражы: 20-22 лістапада ў Архангельску, у лютым—у Сьвярдлоўску, у маі—ў Грозным і ў жніўні—у Арцёмаўску.

Па другой пазыцы індустрыялізацыі будзе 4 тыражы: у сьнежні (першы тыраж) у Ленінградзе, у сакавіку—у Маскве, у ліпені—у Харкаве і ў верасьні—у Тыфлісе.

Чарговы **тыраж 6-ціпроцантнае пазыкі 1922 г.** адбудзецца 2-6 студзеня ў Маскве.

Па 6-ціпроцантнай пазыцы 1924 г. будзе праведзен першы тыраж у сакавіку ў Маскве.

Па 10-ціпроцантнай пазыцы 1927 г. адбудзецца 4 тыражы. Блізкійшы—20-22 кастрычніка ў Саратаве, чарговы—у студзені ў Маскве.

Бліжэйшы тыраж 6ясцроцантнае пазыкі 1926 г. адбудзецца 1-га сьнежня ў Маскве.

Катыроўка 2-е пазыкі Індустрыялізацыі.

МАСКВА, 5-X. З 1-га лістапада другая пазыка індустрыялізацыі ўводзіцца ў біржавыя катыроўкі. З гэтага дню продаж і купля аблігацый гатоўкаю будзе праводзіцца ва ўсіх касах Дзяржбанку, касах ашчаднасьці і іншых катыровачных установах па курсу. Пазыка пад аблігацыі будзе праводзіцца ў разьмеры 60 процантаў наміналу.

Рэкорд Грознага.

РАСТОЎ-ДОН, 4-X. У мінулым гаспадарчым годзе Грознафта выканала цалкам вытворчую праграму па здабычу нафты. Здабыта 3.442 тысяч тон, што зьяўляецца рэкордным здобычам ня толькі ў часе нацыяналізацыі нафтапромыслаў, але і за ўвесь час іх існаваньня. За мінулы гаспадарчы год Грознафтаю праведзена найбуйнейшая праца па рацыяналізацыі. Амаль ажыцьцёўлен пераход экспару да электрычнасьці.

Гарэлку выцісьнем з вёскі.

МАСКВА, 4-X. Прэзыдыум ЦК сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі ўхваліў пастанову аб катэгарычнай забароне продажу гарэлачных напітнаў у сталовых і чайных падначаленых сялянскім камітэтам узаемадапамогі.

Кулакі-гвалтоўнікі.

ХЕРСОН. 4-X. Вынясная сэсія херсонскага акруговага суду разглядзела ў Вяліка-Аляксандраўску справу па абвінавачаньні групы кулакоў вёскі Блакітнае у забойстве ў 1922 г. дзевяці незаможнікаў, зґвалтаваньні і забойстве дзяўчыны бяднячкі і ў іншых злачынствах. Справа была выкрыта толькі сёлета, дзякуючы заяве на імя пракуратуры групы незаможнікаў, што жыхарства вёскі Блакітнай застрашана кулакамі-забойцамі.

На судзе абвінавачаныя кулацкія сынкі Бандарэнка і браты Шолахі тлумачылі свае злачынствы тым, што дзейнічалі згодна загаду начальніка міліцыі—сына абшарніка Бало. Суд засудзіў абвінавачаных да зьняволеньне ў напраўча-працоўным доме на час ад 3-х да 6-ці гадоў.

Узьбечка абудзілася.

САМАРКАНД, 3-X. Перавыбары дэлегатак ва Ўзьбекістане сёлета ўпяршыню праходзяць, як масавая палітычная кампанія. У акруговых і раённых цэнтрах адбыліся шматлюдныя дэманстрацыі-карнавалы, у кішлаві накіраваны агітатары з нацыянальнымі аркестрамі і дакладчыкамі. Асаблівую прыхільнасьць у шырокіх масах спаткаў лёзунг разьняволеньня жанчын.

У часе вялічэзнае дэманстрацыі ў акруговым цэнтры Бэк-Буды 200 узьбечак скінула параньджу, спаленую тутжа на вуліцы. Адмова насіць паранджу ў Кашка-Дар'інскай акрузе (самая адсталая акруга Узьбецкае рэспублікі) набыла масавы характар.

У панскай Польшчы.

ЛЁДЗІНСКАЯ СТАЧКА АДНАВІЛАСЯ.

У ПЕРШЫ-Ж ДЗЕНЬ БАСТАВАЛА ЎЖО 40.000 ТЭКСТЫЛЬШЧЫКАЎ—ЖОЎТЫЯ ПРАФСАЮЗЫ ЎБАКУ АД ЗАБАСТОЎКІ.

ВАРШАВА, 4-X. З прычыны катэгарычнае адмовы прамыслоўцаў здаволіць патрабаваньне лёдзінскіх тэкстыльшчыкаў аб павялічэньні заработку на 20 проц., учора позна ўночы абвешчана ўсеагульная забастоўка. Жоўтыя саюзы не далучыліся да забастоўкі.

Сёньня раніцою ў Лёдзі баставала блізка 40 тысяч тэкстыльшчыкаў. Настрой бастуючых бадзёры. У Лёдзь выяжджае міністр працы Юркевіч, які атрымаў перад выездам спэцыяльныя інструкцыі ад прэм'ера Бартэля. Як відаць, ураду пры дапамозе ППС удасца ліквідаваць забастоўку, на якую дзеячы ППС пашлі не дабраахвотна, а пад нажымам рабочых мас.

Беларуская дэлегацыя.

2 кастрычніка г. г. у віленскага ваяводы была дэлегацыя бацькоў вучняў віленскай беларускай гімназіі з «дырэктарам», як кажа «Дз. Віл.», Астроўскім на чале. Дэлегацыя прасіла заапекавацца над вучнёўскай бурсай пры гімназіі, на што п. ваявода даў сваю згоду.

Выкрыцьцё камуністычнай ячэйкі.

Гэтымі днямі ў вёсцы Уненішкі Рубяжэвіцкай вол. адміністрацыя выкрыла вялікую камуністычную ячэйку і арыштавала 14 асоб. У часе рэвізіі і арышту выкрыта ў некаторых дамох тайныя шыфры і інструкцыі ад ЦК КПЗБ.

Ліквідацыя камуністычнай ячэйкі.

«Слово» (№227) паведамляе, што адміністрацыя зьліквідавала камуністычную ячэйку, «штаб» якой знаходзіўся ў в. Уварышкі, Валожынскага пав. Пры рэвізіі знойдзена камуністычная літаратура, інструкцыі ЦК КПЗБ. пісаныя шыфры і прыватная карэспандэнцыя. Арыштавана 14 асоб.

П. Кіртыкліс ідзе ўгору...

«Дзеньнік Віл.» (№ 226) паведамляе, што ў бліжэйшым часе Рада Міністраў назначыць на пасаду віленскага віцэ-ваяводы п. Кіртыкліса, міністра, як пісьдчыка і дэфэнзыўчыка.

Партыя „Вызваленьне" трашчыць...

23 кастрычніка г. г. у Вільні збіраецца з'езд польскай партыі „Вызваленьне". На з'езьдзе між іншым будзе разглядацца справа спыненьня масавых выпадкаў выступленьняў з партыі нават і такіх асоб, якія знаходзяцца на адпаведных і кіруючых пасадах у партыі.

Арышт беларускага радніка.

«Кур. Віл.» (№ 225) паведамляе, што паліцыя арыштавала радніка Дзевятнаўскай вол., Слонімскага пав. А. Лячко, які часта наведваўся ў м. Косава і гэтым вылікаў з боку паліцыі падазрэньні. У Лячко быццам знойдзена шмат адозваў і нарэкандэнцыя, з якой быццам відаць, што ён актыўны член КПЗБ.

Яшчэ адзін гурток „Т-ва бел. школы" зачынен.

Адначасова з зачыненьнем «Т-ва беларускай школы» ў Вільні, быў зачынен і гурток гэтага т-ва на Новым Сьвеце ў Вільні, які застаецца і цяпер яшчэ зачыненым, ня гледзячы на поўнае адчыненьне «Т-ва бел. школы» ў Вільні.

Як Польшча адбудоўвае З. Беларусь.

«Курьер Варш.» (№ 274) паведамляе, што віленскае ваяводства ўжо два месяцы не атрымлівае в міністэрства публічных работ ніякіх крэдытаў на адбудову гаспадарак, зьнішчаных у часе вялікай вайны. Паводле даных статыстычнай управы, яшчэ застаецца адбудаваць каля 24 тысяч будынкаў, т. ё. каля 33 проц. агульнай лічбы зьнішчаных гаспадарак.

Забастоўка чыгуначнікаў.

У Вільні на бакавой чыгуначнай лініі Тышкевіча забаставалі ўсе служачыя і рабочыя, якія вымагаюць падвышэньня платы.

Чыгуначная катастрофа.

1 кастрычніка на пагранічнай з Нямеччынай ст. Старагард польскі таварны поезд наехаў на такі-ж нямецкі, пашкодзіўшы яго апошні вагон. Цягнік і 3 польскія вагоны зусім разьбіты.

Катастрофа аэрапляну і пажар фабрыкі.

1 Кастрычніка г.г. ў Грудзёндзе-Ізе здарылася незвычайная катастрофа аэрапляну, у часе фігурных экспярыментаў ад аэрапляну адарваўся бак з бэнзінам, які ўзарваўся каля сьцяны фабрыкі. Сьцяна рухнула, зьнішчаючы трансмісію і электрычныя провады. Выбіты ўсе шыбы ў фабрыцы. Пажар зьнішчыў частку фабрыкі.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Вёска расьце і мацнее.

Абудзіліся глухія вёскі Рудзенскага сельсавету, Сьмілавіцкага раёну.

Гаспадарка тут раней вялася падзедаўскаму. Грамадзкім і сямейным жыцьцём вёскі кіравала воласьць з чыноўніцтва і паны. Цяпер вёска за час рэвалюцыі зьмянілася.

Перш-на-перш вёска пачала больш культурна апрацоўваць зямлю, шляхам пераходу на шматпольле і машынізацыю сельскае гаспадаркі. Сяляне пачалі карміць жывёлу па норме і будаваць цёплыя хлявы.

Кожны селянін сее культурную расьліну, як сэрадэлю, лубін і інш.

Асабліва павялічваецца плошча лёну. Каапэрацыя пачынае працаваць добра, сяляне амаль на 90 проц. зьяўляюцца пайшчыкамі. Дзесяць год таму назад яны і паняцьця ня мелі аб каапэрацыі. Камсамол і ячэйка КП(б)Б таксама добра павялі працу. Амаль што ўсе дзеці школьнага ўзросту ахоплены школай. Хутка будзе адпушчан фонд і ёсьць надзея цалкам закаапэраваць беднату.

Меншчына.

Ліквідаваць непатрэбны склад.

Некалькі месяцаў таму назад мазырскі бровар належыў аднаму прыватніку. Каб канкураваць з прыватнікам, у Мазыры існаваў і існуе ў сучасны момант разьліўны склад Белхарчтрэсту. Але ў сучасны момант, калі ранейшы прыватны завод перайшоў у падпарадкаваньне дзяржавы, дык кожны скажа, што склад Белхарчтрэсту трэба ліквідаваць, бо ён канкурыруе з дзяржаўным заводам і гэтым самым перашкаджае нашаму трэсту рэалізаваць сваё піва. У працягу двух месяцаў Белхарчтрэст захапіў амаль увесь рынак і даў пакупцом цэлы шэраг льгот. Калі-ж завод перайшоў у падпарадкаваньне Камтрэсту, дык для яго амаль што ня было збыту, але дзякуючы лепшай якасьці піва, яно паступова завоёўвае рынак. Белхарчтрэст ня сьпіць: ён іншым спосабам дабіваецца рэалізацыі свайго піва. Калі Камтрэст дае крэдыт на 45-60 дзён, дык ён—на 75-90 дзён, і гэтым самым б'е Камтрэст.

У сучасны момант, калі мы праводзім кампанію барацьбы з алкагалізмам, сетка нашых піўных павінна быць звужана, а тут яны наадварот, пашыраюцца, і таму мы зараз ставім пытаньне перад Наркамгандлем аб ліквідацыі ў Мазыры складу Белхарчтрэсту. Сетка піўных павінна быць звужана,—так ставяць пытаньне мазырскія рабочыя. Чакаем станоўчага адказу.

Яўхім.

На панчошнай фабрыцы.

Гомель, 4-X. Абсталяваньне памяшканьня для панчошнае фабрыкі закончана. У бліжэйшы час будзе распачата праводка электралініі для мэханізацыі вытворчасьці. Набываюцца дадатковыя машыны для патрэб фабрыкі. Фабрыка будзе працаваць у 2 зьмены па 50 чалавек у кожнай зьмене. Фабрыка ўключана ў плянавую дастаўку сыравіны, а збытам прадукцыі фабрыка забясьпечана.

Хулігана з камсамолу трэба выгнаць.

(Ворша—Задняпроўе).

У той час, як мы гаворым аб тым, што камсамолец-прызыўнік павінен быць прыкладным для ўсіх іншых прызыўнікоў з беспартыйнай моладзі, мы лічэ можам сустрэць камсамольцаў-прызыўнікоў, якія прыклад даюць адваротны.

Так, камсамолец Задняпроўскай ячэйкі т. Бялько, калі 9-га верасьня адбываўся вечар, наладжаны Задняпроўскай пажардружынай, зьявіўся на вечар п'яны і пачаў бузіць. Калі яго пачалі супакойваць, ён адказаў: „Ня ваша справа мяне супакойваць, я прызыўнік—гуляю апошнія дні".

Бялько выкінулі за дзьверы, а ён узяў камень і пусьціў ім у дзьверы.

Задняпровец.

ЗАЧЫНЯЕМ ПІЎНЫЯ.

Барысаў, 4-X. З 1-га кастрычніка барысаўская каапэрацыя спыніла гандаль півам і «русской горькой» у сваіх сталовых, крамах. Спыніла гандаль гарэлкай і крама Госспірта. Зачынен прыватны піваварны завод у горадзе. Гарадзкі камітэт узаемадапамогі адчыняе пры цэнтральным рабклюбе вялікую чайную. 2 разы ў тыдзень пры чайной будзе граць музыка.

МЭБЛЯВЫ КАМБІНАТ НАЛАДЖВАЕ ПРАЦУ.

Гомель, 5-X. Гэтымі днямі мэблявы камбінат, які працуе зараз у трох мясцох, пераходзіць у абсталяванае памяшканьне, якое раней займала фабрыка па вырабу цьвікоў. Праводзяцца дадатковыя работы па мэханізацыі асобных працэсаў працы. Заказамі камбінат забясьпечан. У гэтым камбінаце будзе занята каля 100 чал.

АБСЛУГОЎВАЕМ РАБОЧЫЯ ПАСЁЛКІ.

Барысаў, 5-X. У рабочым цэнтру—рабочых пасёлках заканчваецца пабудова вялікай крамы, коштам у 13000 рублёў.

Для захаваньня пятрывалых тавараў, пабудован пры краме вялікі склеп і халадзільнік. Крама гэта ў першую чаргу будзе абслугоўваць некалькі сот рабочых сем'яў рабочых пасёлкаў.

БАРАЦЬБА З ПРЫВАТНІКАМ.

Барысаў, 5-X. Заканчваецца пабудова вялікай каўбаснай, у якой будзе занята—8 рабочых. На гэту справу затрачана звыш 11.000 руб.

Каўбасная гэта будзе здавальняць патрэбнасьць гораду каўбасой, з некаторым «экспартам» у другія гарады Беларусі.

Таксама павялічваецца ўзрост мясных крам, лік якіх павялічыўся да 12-ці, з якіх 6 у горадзе і 6--у рабочым цэнтры—Нова-Барысаве.

Звароты па мясному гандлю павялічыліся да 30.000 руб. у месяц.

Прыватнікі ўжо пачынаюць зачыняць свае крамы.

Вынікі кантрактацыі.

ВІЦЕБСК, 4-X. У працягу 1927-28 гаспадарчага году сельска-гаспадарчая каапэрацыя акругі закантрактавала: льна - валакна—14.650 цэнтнэраў, ячменю—363 цэнтнэра, картофелю—26.830 цэнтнэраў, вікі—312 цэнтнэраў.

Уся гэта колькасьць насеньня закантрактавана ў 11.000 асобных сялян, 8 групавых гаспадарак і 47 калгасаў і савгасаў.

Бюджэт зацьверджан.

ВОРША, 3-X. Бюджэт на 28-29 г. зацьверджан па выдатку ў разьмеры 4288874 руб., а па прыбытку—3302488 р.; каштарыс прадугледжвае рост выдатку на апэратыўна-гаспадарчыя і культурна-асьвятныя мерапрыемствы (асьвета, ахова здароўя, прамысловасьць і г. д.); рост даходнасьці частки бюджэту, асабліва ў невыдатковай сваёй частцы, ідзе менш слабым тэмпам, чымся рост выдатковай часткі каштарысу. Гэта можа затрымаць фінансаваньне важных гаспадарча-культурных мерапрыемстваў акругі. Ня ўсе прыбытковыя аб'екты максымальна райёнамі ўчытваюцца і скарыстоўваюцца. Дадзены зазначэньні райвыканкомам і гарсаветам, каб яны прынялі цэлы шэраг практычных мерапрыемстваў для павялічэньня прыбытковае частки бюджэту, максымальна скарацёўшы адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі.

Швэйныя машыны—у загатоўчыя райёны.

Гомель, 5-X. Аддзяленьне дзяржшвэймашыны адаслала 70 швэйных машын у загатоўчыя райёны акругі. Гэтымі днямі чакаецца атрыманьне партыі швэйных машын у лік кастрычнікавага нараду. Частка машын будзе адаслана ў загатоўчыя райёны.

Каапэрацыя расьце.

Барысаў, 5-X. Узрост пайшчыкаў Барысаўскай каапэрацыі за мінулы 27-28 год павялічыўся з 5052 да 7550 чал.

Таксама павялічыўся паявы капітал з 320.00 р. да 72.000 руб.

Крэдытаваньнем пайшчыкі здаволены былі ў суме 147.797 р. 25 к.

Сустракаем дэмабілізаваных.

Гомель, 4-X. Распачаўся прыезд дэмабілізаваных чырвонаармейцаў. Адпаведныя арганізацыі аддаюць чырвонаармейцам належную ўвагу. На станцыі Гомель арганізован агітпункт для абслугоўваньня прыяжджаючых адпускнікоў і прызыўнікоў. Ня гледзячы на важнасьць гэтага пункту, з боку некаторых працаўнікоў чыгункі наглядаецца пасыўнасьць да яго працы. Так, пляц, на якім адбываюцца мітынгі, зборы і праводзіцца іншая праца з адпускнікамі, завален розным будаўнічым хламам. На ўсе просьбы каменданта і заг. агітпункту ачысьціць пляц--не зьвяртаюць увагі.

Падрыхтоўка да тыражу пазыкі.

Гомель, 5-X. Падрыхтоўчая праца па правядзеньню тыражу пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі разгорнута шырока. Тыраж пазыкі пачнецца 7 кастрычніка а 6 гадзіне вечара. Тэатр Калініна будзе ўпрыгожан рознымі лёзунгамі. У Рэчыцы тыраж пазыкі пачнецца 11 кастрычніка ў тэатры Калініна. У Рэчыцы аддзяленьне рабочага банку арганізуе кіёскі па продажу аблігацый розных пазык. Сяляне, члены тыражнай камісіі, наведаюць завод «Двигатель Революции», конскі завод і іншыя прадпрыемствы.

Рэарганізацыя фінансавай сыстэмы ў працкалектывах.

Гомель, 5-X. У сувязі з тым, што сыстэма цэнтралізацыі фінансавых сум калектываў поўнасьцю сябе не апраўдала, праўленьне працкалектываў з 1 кастрычніка перавяло праду працкалектываў на самастойную касавую працу. Кожны калектыў зьяўляецца самастойным у сваёй працы і калектывы не атрымліваючыя сыравіны ў плянавым парадку, павінны будуць таксама ўжыць меры да забясьпечаньня сябе сыравінай. Наогул працкалектыву даецца поўная магчымасьць разьвіваць сваю дзейнасьць.

Зачыняем піўныя.

Барысаў, 4-X. З 1-га кастрычніка барысаўская каапэрацыя спыніла гандаль півам і «русской горькой» у сваіх сталовых, крамах. Спыніла гандаль гарэлкай і крама Госспірта. Зачынен прыватны піваварны завод у горадзе. Гарадзкі камітэт узаемадапамогі адчыняе пры цэнтральным рабклюбе вялікую чайную. 2 разы ў тыдзень пры чайной будзе граць музыка.

Мэблявы камбінат наладжвае працу.

Гомель, 5-X. Гэтымі днямі мэблявы камбінат, які працуе зараз у трох мясцох, пераходзіць у абсталяванае памяшканьне, якое раней займала фабрыка па вырабу цьвікоў. Праводзяцца дадатковыя работы па мэханізацыі асобных працэсаў працы. Заказамі камбінат забясьпечан. У гэтым камбінаце будзе занята каля 100 чал.

Абслугоўваем рабочыя пасёлкі.

Барысаў, 5-X. У рабочым цэнтру—рабочых пасёлках заканчваецца пабудова вялікай крамы, коштам у 13000 рублёў.

Для захаваньня пятрывалых тавараў, пабудован пры краме вялікі склеп і халадзільнік. Крама гэта ў першую чаргу будзе абслугоўваць некалькі сот рабочых сем'яў рабочых пасёлкаў.

Барацьба з прыватнікам.

Барысаў, 5-X. Заканчваецца пабудова вялікай каўбаснай, у якой будзе занята—8 рабочых. На гэту справу затрачана звыш 11.000 руб.

Каўбасная гэта будзе здавальняць патрэбнасьць гораду каўбасой, з некаторым «экспартам» у другія гарады Беларусі.

Таксама павялічваецца ўзрост мясных крам, лік якіх павялічыўся да 12-ці, з якіх 6 у горадзе і 6--у рабочым цэнтры—Нова-Барысаве.

Звароты па мясному гандлю павялічыліся да 30.000 руб. у месяц.

Прыватнікі ўжо пачынаюць зачыняць свае крамы.

Савецкая Беларусь можа стаць садаводным райёнам.

У БССР ЁСЬЦЬ УСЕ ЎМОВЫ ДЛЯ ПАШЫРЭНЬНЯ ПРАМЫСЛОВАГА САДОЎНІЦТВА.—ВІНАГРАД ПАСЬПЯВАЕ НЯ ТОЛЬКІ Ў ПАЎДНЁВАЙ ЧАСТЦЫ БССР, АЛЕ НАВАТ У ПАЎНОЧНЫХ АКРУГАХ.

Вядомы спэцыяліст па садоўніцтву праф. Пашкевіч, які па даручэньні Беларускага Дасьледчага Інстытуту Сельскай і Лясной Гаспадаркі сёлета праводзіў вывучэньне садоўніцтва ў цэлым шэрагу акруг БССР, паведаміў нашаму супрацоўніку наступнае:

БССР мае шмат асартымэнтаў садавіны, якія ў якасных адносінах зьяўляюцца вельмі каштоўнымі і цікавымі. Савецкая Беларусь можа стаць сапраўдным садовым райёнам. Тут ёсьць усё патрэбнае для пашырэньня садоўніцтва: вільгаць, разнастойныя глебы, здавальняючыя кліматычныя ўмовы. Калі на пяшчаных глебах паўднёвых акруг ня могуць расьці яблыні, то тут можна разводзіць каштоўныя гатункі крымскіх ігруш.

У сучасны мамант у БССР поруч з асартымэнтамі чыста прамысловага характару ёсьць шмат мала-таварных гатункаў. І Наркамзем добра зрабіў, калі ўстанавіў для разьвядзеньня толькі пэўныя гатункі садавіны, а з другога боку, пашыраючы прадпрыемствы па тэхнічнай пераапрацоўцы ў віно і інш. прадукты мала-таварную садавіну.

У Савецкай Беларусі могуць добра расьці розныя гатункі чарэшні, на разьвядзеньне якой да гэтага часу мала зварачалася ўвагі. Чарэшня расьце нават у самых паўночных акругах БССР.

Віноград расьце і пасьпявае ня толькі ў паўднёвай паласе, але нават і ў Полацкай акрузе. Таксама растуць грэцкія арэхі, як манжурскі, амэрыканскі шэры і інш. Шляхам гібрыдызацыі можна вывесьці ў БССР хуткасьпелыя гатункі арэхаў.

Вельмі цікавым кутком у сэнсе пашырэньня разнастайных сартоў садоўніцтва зьяўляецца Сож, дзе ёсьць да 120 гэкт. занятых паземкамі. Дзякуючы сплаву, гэта ягадзіна далёка вывозіцца, таксама карысным зьяўляецца разьвядзеньне парэчак, агрэсту.

У БССР можна чакаць у будучыні вялікай карысьці ў вывядзеньні розных гатункаў садавіны. Гэта сьцьвярджаецца зараз тымі посьпехамі, якія дасягнулі ў гэтай галіне сялянне-вопытнікі Мароз у Лепельшчыне і Сыцько—Мазыршчыне. Яны ўжо вывелі разнастайныя і цікавыя гатункі.

Дасьледчыя інстытуцыі па вывучэньні садоўніцтва павінны выкарыстаць усе дасягненьні гэтых двох вопытнікаў у сэнсе культаваньня і распаўсюджаньня выведзеных у іх гатункаў садавіны.

Беларуская С.-Г. Акадэмія павінна накіроўваць да Мароза і Сыцько студэнтаў на практыку, з другога боку, трэба, каб Наркамзем, Беларускі Дасьледчы Інстытут і мясцовыя органы ўлады больш чула адносіліся-б да гэтых сялян-вопытнікаў. Трэба дапамагчы ім ня толькі маральна, але і матар'яльна, трэба стварыць нармальныя ўмовы для працы і для працягненьня вопытаў.

Мушу яшчэ спыніцца на тым, што ў большасьці калгасаў БССР сады знаходзяцца ў занядбанасьці. Гэта трэба тлумачыць, з аднаго боку, тым, што калгасы атрымалі ўжо разбураныя сады, з другога боку—што ў БССР вельмі слабы ў колькасным сэнсе інструктарскі пэрсанал, які мог-бы сачыць за адраджэньнем запсаваных садоў. Таксама трэба зьвярнуць увагу на ўзмацненьне барацьбы з садовымі шкоднікамі, якія псуюць таварны прадукт і паніжаюць рыначную каштоўнасьць яго.

Пры рацыянальнай пастаноўцы садовай гаспадаркі БССР з часам можа стаць сапраўдным садаводным райёнам накшталт Крыму. А для гэтага ў БССР ёсьць усё магчымае.

Наладзілі справу ўзаемадапамогі.

На 1 кастрычніка 1927 г. у Кузяўскі сельскі камітэт узаемадапамогі ўваходзіла 300 двароў з 1000 сябрамі з 13 насельных пунктаў. На 1 жніўня 1928 г. камітэт ужо аб'яднае 419 двароў і 1287 сяброў з 48 насельных пунктаў.

У апошнія перавыбары абрана 23 упаўнаважаныя, з іх 2 жанчыны. Упаўнаважаныя ўсе працуюць актыўна. **Асабліва актыўна працуе ўпаўнаважаны-сябра прэзыдыуму сельскому жанчына Кавяровіч.**

У сучасны момант камітэт склаў каштырыс і ўзьняў хадайніцтва аб куплі 4—5-цісільнага рухавіка, да якога маркуецца прыбудаваць цыркулярку і малацілку, што дасьць магчымасьць абмалачваць усім сябром таварыства.

У мінулыя гады, з прычыны адсутнасьці агульнай сыстэмы сяброўскіх узносаў, былі ўстаноўлены па 10 кап. з дзесяціны, а за 1927-28 г.—на 50 кап. ад двара. Сёлета ўзносы налічваюцца па ўстаноўленай агульнай сыстэме—5 проц. ад падатку.

Зваротныя пазыкі сысканы на поўнасьцю: усяго належала ўзыскаць 329 п. і 66 р., а сыскана 186 пуд. і 54 р.

Камітэт мае зямельны вучастак у 8 дзес. ральлі і 4 дзес. сенажаці. Вучастак у мінулыя гады **апрацоўваўся грамадзкімі сіламі.** Сёлета засеена 2 дзесяціны жыта, 1 дзес. бульбы пад кантрактацыю, 2 дзес. лубіну і 160 саж. кораньплодаў, аўса 0,30 дзес. Астатняя частка ранейшым складам камітэту была на адзін год аддадзена пад засеў беднаце.

Дзеля ўгнаеньня глебы камітэт ужывае попел, па якому пасеяна ўся бульба і буракі. Жыта сеецца на лубіне; ураджай сярэдні. Сенажаць прададзена беднаце за 107 руб. Прыбытку летась зямельны вучастак даў 91 руб. грашыма, 78 пудоў жыта і 9 п. аўса.

Пракатны пункт значна пашырыўся. Ён мае 7 машын, 2 плугі, малатарню, «Трыер», арфу, сартыроўку і пружынную барану.

У пасеўную кампанію праведзены сярод сяброў гутаркі па растлумачэньню значэньня і важнасьці кампаніі. **На сельніцтву ачышчана 1300 пуд. насеньня. Загатоўлена і выдадзена 55 бядняцкім гаспадаркам 193 пуды насеньня.**

Наогул, камітэт шпаркімі крокамі ідзе наперад, арганізуе вёску і што раз больш пашырае яе абслугоўваньне. Аўтарытэт камітэту ў вачох сялянства добры, сувязь са ўсімі арганізацыямі і ўстановамі сельсавету і раёну здавальняючая.

Недастаткова толькі праца ў каапэраваньні беднаты і ў правядзеньні справаздачнасьці перад насельніцтвам, слабая праца па калектывізацыі вёскі і ня вусім дастатковы ўдзел у кампаніях па самаабкладаньню, рэалізацыі пазыкі і г. д.

Па ліквідацыі гэтых недахопаў Кузяўскі камітэт будзе адным з прыкладных камітэтаў.

Я. К.

ШТО ТРЭБА ЗРАБІЦЬ У „ДЗЕНЬ УРАДЖАЮ".

З году ў год савецкая ўлада і сялянства БССР праводзяць сьвята «Дню ўраджаю». Кожны год мы выяўляем свае недахопы і дасягненьні ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці; але першы год мы рашуча і настойліва ставім пытаньне аб падвышэньні ўраджайнасьці. Шырокая дыскусія, якая разварачваецца ў друку аб шляхох і мэтадах падвышэньня ўраджайнасьці ў БССР, прымушае нас асабліва шырока выкарыстаць у гэтым напрамку надыходзячае сьвята «Дню ўраджаю». Гэты дзень павінен быць найлепшай выкарыстан зямельнымі працаўнікамі і сялянствам для абгаварэньня ўсёй сыстэмы мерапрыемстваў эканамічнага і агратэхнічнага характару, якія дапамагаюць павялічэньню ўраджайнасьці.

У гэтым сьвяткаваньні асабліва важнае значэньне набывае ўдзел дасьледчых станцый і сялян-дасьледчыкаў. Часта ў глухіх мясцох, далёка ад культурных цэнтраў, у цяжкіх варунках, дасьледчыя станцыі і сялянне-дасьледчыкі ўпарта і настойліва вядуць каласальную працу па вывучэньню ўмоў с.-г. працэсу, па адшуканьню лепшых прыёмаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці. Перад дасьледчымі станцыямі стаіць надзвычайна вялікая задача—вывучыць усе тыя агратэхнічныя мерапрыемствы, камбінацыя якіх у кожнай гаспадарцы райёну іх дзейнасьці дасьць павялічэньне ўраджайнасьці ў 2-3 разы.

Трэба адзначыць, што за 5-7 год працы дасьледчыя станцыі вывучылі ўжо значны шэраг мерапрыемстваў, павялічваючых ураджайнасьць.

Дасьледчыя станцыі на дасьледчых палёх, пры дапамозе цэлага шэрагу агрыкультурных прыёмаў, дабіліся ў 3-4 разы большых ураджаяў, у параўнаньні з сярэднімі ўраджаямі БССР. Гэта сьведчыць, што **высокія замежныя ўраджаі ў 150-200 пудоў на дзесяціну зьяўляюцца і для нас бязумоўна магчымымі.** Але гэта нікольні не перашкаджае нам, побач з высокімі ўраджаямі на дасьледчых палетках, мець надзвычайна нізкія ўраджаі ў суседніх сялянскіх гаспадарках і нават у самой гаспадарцы дасьледчай станцыі.

Аддаючы належнае месца ў гэтым зьявішчы эканамічным фактарам, некаторую частку трэба аднесьці на кошт незнаёмства насельніцтва з лепшымі агратэхнічнымі прыёмамі вядзеньня сельскае гаспадаркі. Загэтым дасьледчым станцыям і сялянам-дасьледчыкам трэба сканцэнтраваць усю сваю ўвагу на высьвятленьні агратэхнічных мерапрыемстваў, павялічваючых ураджайнасьць. Трэба шырока азнаёміць савгасы, калектыўныя гаспадаркі і ўсё сялянства ў «Дзень ураджаю» з тымі прыёмамі вядзеньня сельскае гаспадаркі, пры ўжываньні якіх можна атрымаць падвойны ўраджай.

Тут у першую чаргу паўстае пытаньне **ўгнаеньня глебы.** Нашы лёгкія пескавыя, супескавыя і нават суглінкавыя глебы, за рэдкім выключэньнем, надзвычайна бедны спажыўнымі матэрыямі. Гэтаму пытаньню дасьледчыя станцыі і сялянне-дасьледчыкі ўдзяляюць выключную ўвагу. Тут і пытаньні рацыянальнага выкарыстаньня гною, лубіну, торфу, а таксама розныя прывазныя мінэральныя ўгнаеньні і беларускія агранамічныя руды,—як фасфарыт, вапна, крэйда, мэргель і інш—усё гэта ў розных камбінацыях займае пэўнае месца ў досьледах дасьледчых станцый і сялян-дасьледчыкаў. Сёлета па лініі райённых аграномаў, Інстытуту сялян дасьледчыкаў і дасьледчых станцый на гэту работу адпушчаны значныя сродкі па каштарысу НКЗ. Усе, хто праводзіў гэтыя досьледы, у «Дзень Ураджаю» павінны азнаёміць шырокія колы сялянства з вынікамі гэтых досьледаў. Кожны селянін павінен добра даведацца, як угнойваць зямлю, каб мець добры ўраджай.

На другім месцы па значнасьці трэба паставіць **палепшаныя севазвароты.** Гэтаму пытаньню асабліву ўвагу ўдзяляе Горацкая С. Г. дасьледчая станцыя, але і другія станцыі маюць матар'ял па арганізацыі лепшых севазваротаў для свайго райёну.

Далей, **выкарыстаньне амаль мільёну гэктараў плошчы папару,**—шляхам увядзеньня занятога папару і закладкі штучных выпасаў, займае ўвагу дасьледчых станцый. Зараз гэта плошча ў сялянскай гаспадарцы не дае ніякага прыбытку, бо нельга лічыць за прыбытак некалькі дзесяткаў пудоў розных бур'янаў, якія растуць на ўзесяціне позьняга сялянскага папару і служаць для харчаваньня жывёлы ў летні час. Гэта пытаньне—**закладка штучных выпасаў**—асабліва шырока разгарнулася ў апошні год. Была дадзена дырэктыва з вышэйшых органаў аб закладцы 250 вучасткаў штучных выпасаў, з дасьледча-паказальнымі мэтамі, у савгасах, калгасах, мэліяцыйных таварыствах і пасёлках. Ад закладзеных шматгадовых выпасаў сёлета мы яшчэ ня будзем мець сталых выпасаў, але азнаёміць насельніцтва і выкарыстаць вопыт закладкі штучных выпасаў для будучага году—задача „Дню Ураджаю".

Вывядзеньню і спрабаваньню новых гатункаў розных сельска-гаспадарчых расьлін дасьледчымі станцыямі аддаецца таксама шмат сілы і сродкаў. Беларусь позна ўст

НА ГАСПАДАРЧЫМ ФРОНЦЕ.

Лясная гаспадарка.

УПАРАДКАВАНЬНЕ ЛЯСОЎ ДЗЯРЖАЎНАГА І МЯСЦОВАГА ЗНАЧЭНЬНЯ.

У 1927-28 г. Наркамзем праводзіў працу ў упарадкаванню лясоў дзяржаўнага значэньня на плошчы ў 444.000 гэкт. Калі гэта заданьне будзе поўнасьцю выканана, то зараз у БССР будзе ўжо 60 проц. упарадкаваных лясоў дзяржаўнага значэньня. На гэтыя работы вызначана 601.000 руб.

Лесаўпарадкаваньне найбольш шырока разгарнулася ў паўднёвай частцы БССР, галоўным чынам, у вадазборы Дняпра, у увязі з запатрабаваньнямі на лесаматэрыялы на Дняпрабудзе. Апроч гэтага, лесаўпарадкаваньне дзяржаўных лясоў праводзіцца і ў іншых округах БССР.

На 1928-29 г. на пляну вызначана ўпарадкаваць 890.000 гэкт. лясоў дзяржаўнага значэньня, а рэшта неўпарадкаваных лясоў будзе ўжо поўнасьцю закончана ў 1929-30 г., пасьля чаго распачнецца рэвізійнае абсьледаваньне лясоў.

На ўпарадкаваньне лясоў у 1928-29 г. вызначана 820.000 руб.

Адначасна з гэтым праводзіцца лесаўпарадкаваньне лясоў мясцовага значэньня. У 1928-29 г. мае быць упарадкавана 100.000 гэкт. лясоў мясцовага значэньня. (Гэтым і будзе закончана ўпарадкаваньне лясоў мясцовага значэньня) На гэту справу будзе затрачана 100.000 руб.

ДАРЭМНЫ ЛЕС СЯЛЯНСТВУ.

На 1928-29 г. для ўсяе БССР у фонд на водпуск дарэмнага і льготнага лесу сялянству прадугледжана 400.000 руб., а ў фонд крэдытаваньня — 900.000 руб. Дарэмна і на льготных умовах атрымае 40 проц. насельніцтва—беднякі і калгасы, сераднякам, ці 45 проц. насельніцтва, лес будзе адпускацца па таксе 1924 г. з надбаўкаю ў сярэднім 50 проц., а заможнай частцы сялянства (15 проц.)—з надбаўкаю ў 100 проц.

У Менскай акрузе будзе адпушчана сялянству дарэмнага лесу на 70 тысяч руб., у крэдыт на 170 тысяч руб. (летась—140 тысяч руб.).

ЛЕСАРАСПРАЦОЎКІ Ў МЕНСКАЙ АКРУЗЕ.

У Менскай акрузе ў 1928-29 г. вызначана для сялянства 166.266 куб. мэтраў страявога лесу і 223.808 куб. мэтр. дроў. Сялянскія гаспадаркі і калгасы маюць права затаўляць лес з пня.

За падвоеньне ўдояў у калгасах.

(З вопыту калгасаў Віцебшчыны).

Удоі калгасаў ня розьняцца ад удояў сялянскіх гаспадарак, а ў некаторых выпадках яны нават нізкі апошніх. З 54 калгасаў (старой сеткі) толькі ў двух-трох абдзяньнях удоі досыць добрыя, якія даюць 110-120 пудоў у год ад аднэй кароты. Сярэдні-ж удой на калгасах дае 60,4 пуда ў год ад каровы, у той час, калі сярэдні ўдой сялянскай кароты дае 64 пуды год. Зразумела, што пры гыткіх удоях мала ў калгасах вяўляецца стратных.

Галоўныя прычыны стратнасьці жывёлаводзтва, на нашай думцы, складаюцца з наступных моментаў.

Стады дрэнна падабраны.

Аборы дрэнныя.

Параўнаўча вялікі процант моладзняка да дойных кароў, моладняк складае 49 проц., той час калі нармальным трэба лічыць 5 проц., максымум 38 проц.

Ацёл адбываецца, галоўным чынам, вясной, г. зн. найбольшая колькасьць малака нынае тады, калі цана на гэты прадукт ізкая.

Каровы, якія гадуюцца ў сваіх гаспадарках, дзякуючы дрэннаму догляду, а часьці заўчасной злучцы, аказваюцца часта горшымі за купленыя на баку.

Выводы адсэтуль самі напрашваюцца.

Палепшаньне жывёлаводзтва нам адасюда трэба праводзіць наступным чынам:

Асьцярожны падбор стада і паступовая выбракоўка горшых экземпляраў.

Кіраўнікам калгасаў належыць памятаць, што карова, якая дае менш 75-80 пудоў малака ў год, бязумоўна, зьяўляецца стратнай для гаспадаркі. Пры падборы стада яго трэба ганяцца за таньным быдлам, лепш пераплаціць на 25 і нават 50 руб. даражэй, але купіць добра-малочную карову.

Палепшаньне стада павінна праводзіцца з кошт застаўленьня на племя цялят ад лепшых кароў і праверанага быкоў.

Добрыя ўдоі зьяўляюцца вынікам ня толькі добра падабранай породы, але і добрага догляду і кармленьня. Заграніччнае быдла трымілае каля 40-50 пудоў канцэнтраваных кармоў і каля 300-400 пуд. корнеплодаў у год на кожную галаву.

У нас-жа канцэнтраваны корм у калгасах райёнах адсутнічае. Многія надаюць канцэнтраванаму корму вялікае значэньне, яе ўжываюць яго ў сваёй гаспадарцы вельмі рэдка, бо лічаць, што сільны корм вельмі дарагі і таму гэта не заўсёды апраўдваецца ў гаспадарцы. Найбольш танны корм, водлуг укараніўшайся ў нас думкі, лічыцца салома і сена. Гэты погляд ні ў якой меры не адпавядае сапраўднаму становішчу рэчаў, а вяўляецца хутчэй у выніку доўгагадовага прызвычаеньня.

Усім калгасам трэба памятаць старую прыказку: «у каровы малако на языку», што малако выпрацоўваецца з ужываемага корму, што карова—гэта жывая машына, якая перапрацоўвае корм у малако, а таму атрыманьне гэтага прадукту (пры добрых задатках каровы) знаходзіцца ў поўнай залежнасьці ад якасьці і колькасьці корму. Да гэтага ўсяго трэба дадаць, што трэба зусім адмовіцца ад кармленьня на „вока", або кармленьня да адказу. Лішня зьедзены корм, як і недакорм, шкодна адбіваецца на жыцьцядзейнасьці арганізму жывёлы і ўрэшце вядзе да зьніжэньня ўдояў. Карміць жывёлу трэба на вазе, на ўдою і сьцельнасьці каровы. Удой жывёлы, апроч кармленьня, залежыць ад умоў догляду і ас.

Правільнае кармленьне немагчыма біз добрых цёплых хлявоў, без кармушак і адпаведнага догляду. Прывязьленьне абор у належны стан зьяўляецца пытаньнем дня. Час ацёлу мае таксама вялікае значэньне ў малочнай справе. Прыбытковасьць жывёлаводзтва павялічваецца пры пераходзе на асеньнія ацёлы. Пераход на асеньнія ацёлы патрабуе кароннага зьмяненьня жывёлаводчай гаспадаркі.

У заключэньне неабходна сказаць, што прыбытковасьць жывёлаводзтва залежыць ад саміх гаспадароў. Нельга чакаць добрых вынікаў ад жывёлы, калі за ёй няма неабходнага догляду.

Водлуг нашай думкі, у калгасах маюцца ўсе магчымасьці для палепшаньня малочнай гаспадаркі. Аборы маюцца, патрабуюць толькі рамонту, а ў некаторых калгасах абсталяваньня кармушак. Выторгы—быкі маюцца амаль на ўсіх калгасах. Збыт малака ў калгасах хутка можна знайсьці. Для палепшаньня і павялічэньня стад быдла, дзяржава адпушчае шмат крэдытаў. На нашай акрузе маецца шмат калгасаў, якія атрымалі доўгатэрміновы крэдыт на 2000 руб. на прадукцыйную жывёлу.

Усе гэтыя моманты пацьвярджаюць нашы довады і гаворыць, што намеркаванае намі можна выканаць, трэба ажвесьці жывёлаводзтва з надпарадкаванага становішча ў гаспадарцы. Задачы калгасу ў галіне жывёлаводзтва складаюцца з таго, каб так рацыянальна паставіць гэту галіну сельскай гаспадаркі, каб кожная карова давала падвойны-патройны ўдой. Павышэньня ўдояў можна і трэба дабіцца.

Трэба палепшыць умовы догляду жывёлы. Гэта адразу дасьць добрыя вынікі ў сэнсе павышэньня ўдояў.

Слова за калгаскімі.

Агранам Д. С. Пліс.

КААПЭРАЦЫЙНЫЯ АРЦЕЛІ РАСТУЦЬ.

У сьнежні месяцы 1927 г. была арганізавана першая арцель шаўцоў у ліку 5 чалавек пад назвою «Уперад» (пры пазыка-ашчадным таварыстве была адчынена крама, якая дастаўляла аматужнікам адзінкам тавар, але не патрэбнай колькасьці, частку мар'ялаў прыходзілася ім купляць на прыватным рынку. Крама ў першую чаргу дастаўляе тавар каапэраваным аматужнікам. Арцель паступова расла ўмацоўвалася, хоць нямала цяжкасьцей ім прыходзілася перамагаць.

Гомельскі «Кустпромсаюз» гэтую арцель і прызнаваць не хацеў, толькі пасьля доўгае барацьбы гэтая арцель была прызнана і ўключана ў пляновую дастаўку.

Праз некаторы час па ініцыятыве праўленьня пазыка-ашчаднага таварыства быў арганізован цэлы шэраг арцеляў, як, напр., мужчынская кравецкая арцель у складзе 8 чал., шапачная арцель з 7 чал. і шорная арцель з 5 чалавек.

У сучасны момант у арцелях налічваецца да 50 чалавек, што складае 30 проц. агульнага ліку каапераваных самапрацыкаў.

Сацыяльны склад арцеляў выключна на бядняцка-серадняцкі. За кошт фонду беднаты каапэраваны тры беднякі.

Арцелі пераважна абслугоўваюць вёску, усю сваю гатовую прадукцыю яны рэалізуюць праз каапэрацыю.

Яўхім.

(Мазыр).

ЯК ІДУЦЬ ЗАГАТОЎКІ.

Посьпехі ў хлебазагатоўках спажывецкай каапэрацыі.

У ВЕРАСЬНІ НЕПАСРЭДНА АД СЯЛЯН ЗАГАТОЎЛЕНА 64609 ПУД. ХЛЕБА.—ПАМОЛЬНЫ ЗБОР ДАЎ 149533 ПУД., ЦІ 182 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ.—СЛАБА СТАІЦЬ СПРАВА З ЗАГАТОЎКАЙ БУЛЬБЫ.

Загатоўка хлебапрадуктаў непасрэдна ад сялянства фактычна распачалася толькі з першых дзён верасьня. Вынікі загатовак за гэты месяц сьведчаць, што спажывецкая каапэрацыя Беларусі мае досыць значныя дасягненьні.

Так, па яшчэ няпоўных вестках сыстэма спажывецкай каапэрацыі ў верасьні загатовіла непасрэдна ад сялянства 64.609 пуд. розных хлебапрадуктаў і такім чынам свой месячны плян выканала амаль на 100 проц.

Асаблівыя посьпехі мае каапэрацыя ў галіне загатоўкі з памольнага збору, якога паступіла на ўсёй сыстэме 149533 пуд., ці 182 проц. плянавага заданьня. Ня меншы посьпех і ў галіне загатовак семя-лёну —загатоўлена 36600 пуд. і такім чынам заданьне выканана на 310 проц.

Калі ўзяць хлебазагатоўкі непасрэдна ад сялянства і паступіўшы ў спажывецкую каапэрацыю памольны збор, дык за верасень месяц па вэрнавых культурах каапэрацыя сваё заданьне выканала ў сярэднім на 146 проц.

Як-жа праходзяць загатоўкі па асобных арганізацыях спажывецкай каапэрацыі?

У галіне загатовак хлеба на першым месцы стаіць Слуцкае аддзяленьне Белкаапсаюзу, якое выканала сваё месячнае заданьне на 197 проц. Досыць добра стаіць справа з выкананьнем заданьня і ў Магілеўскім аддзяленьні «Днепрасаюзу»—там загатоўлена 127 проц. месячнага пляну.

На іншых-жа округах справа загатовак стаіць слабей, хоць некаторыя округі і блізкі да выкананьня сваіх верасеньскіх плянаў. Да прыкладу Бабруйшчына выканала свой плян на 92,5 проц.

Па памольнаму збору, за выключэньнем Гомельшчыны і Мазыршчыны, па ўсіх округах справа стаіць добра. Так Аршаншчына выканала сваё заданьне па памольнаму збору на 353 проц., Полаччына—на 491 проц. і г. д.

У галіне загатовак ільнянога семя посьпехі па ўсіх округах прыблізна аднолькавыя—добрыя.

Усё-ж дасягненьні ў галіне хлебазагатовак нас ня могуць цалкам задаволіць, бо ёсьць цэлы шэраг спажывецкіх таварыстваў, якія вельмі слаба арганізуюць навакольнае сябе здатчыка зярна і ў якіх хлебазагатоўкі не атрымалі належнага разьвіцьця. Зразумела, што ў гэтых мясцох слабасьцю працы каапэрацыі карыстаецца прыватнік, які не застанаўліваецца перад павышэньнем цэн на хлеб, абы ён папаў яму ў рукі.

Дагэтуль яшчэ ёсьць паасобныя мясны, якія не ахоплены спажывецкімі таварыствамі, бо ўсё яшчэ «торгуются» з млынарамі і ніяк ня могуць дагаварыцца.

Слаба зьвернута ўвага мясцамі і на загатоўку бульбы. Відаць, нізавыя таварыствы лічаць, што бульбенае пытаньне для іх вельмі дробнае пытаньне і таму ня трэба на яго марнаваць часу. Між тым сялянства вывозіць бульбу на рынак у дастатковай кольвасьці і можна было-б разгарнуць загатоўку.

Нашым нізавым працаўнікам спажывецкай каапэрацыі трэба прыняць усе меры да таго, каб яшчэ больш узмацніць тэмп загатовак. Ніводная таварыства не павінна быць, якое не вяло-б загатавіцельную працу. З—ў.

Загатоўкі збожжа і кантрактацыя.

Вясной гэтага году Чавускае сельска-гаспадарчае крэдытнае т-ва заканкрактавала піваваранага ячменю 450 пудоў (100 проц. заданьня), ільнянога семя 1043 пуды (80 проц. заданьня) і валакна 750 пудоў (59 проц. заданьня).

Кантрактацыі жыта не праізвадзіла. У сучасны момант сялянства ўжо прыступіла да выкананьня заключаных умоў па кантрактацыі галоўным чынам па ільняному семені, і здаюць свыш умовы на 50 проц. Ёсьць выпадкі выкананьня на 200 проц.

Загатоўкі збожжа, акрамя кантрактацыі, амаль што не разгарнуліся. Загатоўка жыта выканана толькі на 25 проц. месячнага заданьня з тэй прычыны, што да гэтага часу Магілеўскі акруговы саюз с-г. каапэрацыі не адпусьціў крэдыту, ня гледзячы на тое, што сам ён крэдыт атрымаў даўно. Адсутнічаньне крэдыту перашкаджае загатоўкам і дрэнна адбіваецца на працы г. ё. прыходзіцца рабіць загатоўкі на тыя грошы, якія прызначаны для крэдытаваньня сялянства.

Ёсьць выпадкі канкурэнцыі з боку загатавіцеляў і парушэньня лімітных цэн, напрыклад, за пуд ільнянага семя добрай якасьці (97 проц. занест 2 р. 10 к. плацяць 2 р. 20 к. (Дзяржгандльбел.). У загатоўках пазіраецца паралелізм, у той час, калі пчаціну загатаўляюць прадстаўнікі Дзяржгандльбелу, купляюць пчаціну і спажывецкая і крэдытная каапэрацыя, а потым здаюць Дзяржгандльбелу. Скурсыравіну загатаўляюць прадстаўнікі скурсындыкату, а побач з імі загатаўляюць спажывецкая і крэдытная каапэрацыя і тут-жа на месцы ўсю загатоўленую сыравіну здаюць агенту скурсындыкату.

Дзякуючы такому паралелізму, загатавіцелі ірвуць з рук сялянства пчаціну і скурсыравіну, кожны дзеля сабе, ад чаго ёсьць выпадкі парушэньня цьвёрдых цэн. Ёсьць непатрэбных выдаткі на ўтрыманьне непатрэбных спецаў у спажывецкай і крэдытнай каапэрацыі.

Чавусы. Лапіцкі.

Загатоўкі неабходна аздаравіць.

(Некаторыя вынікі і пэрспэктывы).

Скончыўся гаспадарчы год і пачынаецца новая кампанія на загатоўцы сельска-гаспадарчай сыравіны.

На падставе даных, якія ў нас маюцца, можна судзіць, што загатоўчая дзейнасьць 1927-28 г., на сваіх выніках параўнаўча прайшла здавальняюча, але адначасова з гэтым трэба са ўсёй рашучасьцю падкрэсьліць, што гэта „здавальняюча" дасягнута праз вялікія цяжкасьці, бо ў працягу мінулага гаспадарчага году было зроблена шмат памылак.

У працягу ўсяго году мы на старонках «Савецкай Беларусі» рэагавалі на тыя ненармальнасьці і дэфэкты, якія назіраліся ў загатоўчай дзейнасьці. Нашым рэгулюючым органам вельмі цяжка было рэгуляваць рынак і прымусіць „мірыць" варожыя загатоўчыя лягеры; загатоўцы вельмі часта не маглі падзяліцца рынкам, не маглі спакойна глядзець адзін другому ў вочы... Наркамгандаль БССР прыходзілася вельмі часта адрывацца ад сур'ёзных цытаньняў і працінь час на дробныя нязначныя факты, якія маглі быць уладжаны на месцах, але справа ў тым, што з-за кожнай дробязі пісалася на 20-30 паперак. Наркамгандаль ўсё гэта прыходзілася чытаць і разьбіраць. І вось гэтыя «буйныя дробязі» часта вельмі перашкаджалі спарэдуднай працы, адмоўна і шкодна ўплывалі на ход нашых загатовак ня толькі ў адносінах колькасьці, а галоўнае ў адносінах якасьці. Ніводная году ня было столькі нараканьняў, як сёлета.

Замест таго, каб цікавіцца, як палепшыць якасьць валакна, як забясьпечыць сябе добрай тарай—гаварылі і працілі час на дробязі. Гэта адзін з найбольш буйных недахопаў нашай мінулай працы.

Далей, трэба спыніцца на пытаньні аб дастаўцы ў райёны прамтавараў і хлеба. На гэтай глебе таксама адбываліся сур'ёзныя непаразуменьні. Каапэрацыя, у руках якой прамтавары знаходзіліся, часта злоўжывала гэтым і выдавала прамтавары тым здатчыкам, якія здавалі сыравіну непасрэдна толькі ёй, зусім ігнаруючы пастанову ўраду аб дастаўцы прамтавараў усім здатчыкам.

Разьвядная агентура ў нас працавала слаба; загатоўцы чакалі, пакуль сяляне прынясуць тавар, замест таго, каб самім выехаць на райёны і выяўляць усе магчымасьці для ахопу рынку. Пытаньне аб стварэньні шырокай сеткі лёнаапрацоначных пунктаў у працяку цэлага году абгаварвалася ў габінэтах і да гэтага часу ніякіх вынікаў няма, а між тым, стварэньне такіх пунктаў спрыяла-б палепшаньню якасьці валакна.

Вось тыя асноўныя памылкі, якія назіраліся вельмі часта ў практыцы нашай загатоўчай працы. І калі яшчэ дадаць, што ў справу рэгуляваньня рынку ўмешваліся ўсе, хто толькі хацеў, пачынаючы ад старшыні сельсавету і канчаючы міліцыянэрам, які разганяў некаторых загатоўцаў, дык малюнак загатовак мінулага году будзе зусім ясным.

Трэба аздаравіць рынак.

Неабходна ўжыць самыя рашучыя меры, каб гэтага больш ня было; трэба стварыць такія ўмовы, пры якіх можна было-б весьці нармальную працу, а для гэтага патрэбен каранны пералом у нашай працы. Неабходна, папершае, каб справамі рэгуляваньня кіраваў выключна Наркамгандаль і яго акругавы і на месцах. Падругое—загатоўка пушнінаў павінна быць сурова распісываная, а экспарт пушнінаў павінен быць перададзен у адны рукі. Трэцяе—павінна быць вызначана цьвёрдая загатоўчая сетка, каб на было канкурэнцыі паміж райёнамі. Чацьвертае—лёнаапрацоначныя пункты павінны з самага пачатку кампаніі быць гатовы да прыняцьця ільнянай сыравіны. Пятае—загатоўчыя райёны павінны своечасова снабжацца прамтаварамі. Шостае—фінансавыя органы павінны бездакорна выконваць заданьні па фінансаваньню, у першую чаргу каапэрацыю, у гэтым напрамку ў мінулым годзе справа абстаяла вельмі дрэнна. Нарэшце, сёмае—павінна быць у корані сынена барацьба за рынак, за яго «гегемонію».

Адначасна неабходна закрануць пытаньне аб экспарце. Мы ўжо не адзін раз адзначалі, што ня ўсе адпаведныя адносіны да заданьняў экспарту, ня ўсе на месцах уявілі сабе гэтае заданьне, і трэба сказаць, што аб важнасьці і сур'ёзнасьці экспарту нам яшчэ прыдзецца гаварыць, але пакуль, на парозе новага гаспадарчага году трэба памятаць, што посьпех экспарту выключна залежыць ад нас саміх. Гэтае пытаньне павінна быць абмяркована ня толькі экспартэрамі, але і шырокімі масамі, каапэрацыйнымі арганізацыямі і ўсімі зацікаўленымі ў росквіце нашай прамысловасьці.

Леўскі.

Хлебазагатоўкі праходзяць слаба.

Барысаў. У нашым раёне налічваецца сем спажывецкіх таварыстваў. Да гэтага часу, ня гледзячы на прапановы, як з боку вышэйшых загатоўчых органаў, а таксама і з боку РВК, загатоўка хлеба і сыравіны праходзіць зусім слаба.

Напрыклад: з сямі патрэбт-ваў распачалі загатоўку толькі Ленінскае, Карсакаўскае, Зембінскае і Барысаўскае.

Але загатоўка праходзіць вельмі слаба.

Гэта ўсё тлумачыцца тым, што наша высковая каапэрацыя ня мае ходкіх тавараў, патрэбных сялянству.

У першую чаргу неабходна забясьпечыць каапэрацыю ходкімі таварамі, бо ёсьць шмат сялян, якія жадаюць абмяняць збожжа на тавар.

Мінулы год паказаў нам нядбайнасьць некаторых упаўнаважаных на хлебазагатоўках, якія больш дапамагалі прыватніку, але яны панесьлі кару за заслугах. Быў час у нас у Барысаве, калі ў каапэрацыі адчуваўся недахоп мукі, прыватнікі малолі па некалькі тысяч пудоў збожжа. Неабходна на акраінах гораду адчыніць крамы выключна для загатоўкі хлеба і сыравіны. Бо ёсьць і цяпер шмат выпадкаў, калі прыватнік перайме сялян на дарозе і купляе ўсё збожжа.

Тых працаўнікоў, якія будуць нядбайна выконваць свае абавязкі і зрываць загатоўкі, аддаваць пад суд.

Барысаўскаму РВК патрэбна кожны тыдзень заслухоўваць справаздачу ўпаўнаважаных па хлебазагатоўках. Гэты год павінен даць нам станоўчыя вынікі ў справе загатовак.

А. Станкевіч.

БЕЛАРУСКІ СТУДЭНТ.

Такая „практыка" карысьці ня дасьць.

Вытворчая практыка для студэнта паогул і агранома ў прыватнасьці мае вялікае значэньне, як першае карыстаньне і замацаваньне тэарэтычных ведаў, набытых ім у навучальнай установе. З гэтай мэтай студэнты-аграномы III курсу Бел. С.-Г. Акадэміі пасланы ў розныя ўстановы і прадпрыёмствы Беларусі.

Але ня ўсюды практыканты сустрэлі належныя ўмовы для працы.

Так, у Калінінскай акрузе загадчык савгасу прымусіў практыканта вазіць гной, рыць ямы, канавы і іншае, толькі не па спэцыяльнасьці, і толькі на другі месяц працы па патрабаваньню вытворчай камісіі Аграфаку, праз Белсельтрэст, гэтыя ненармальныя зьявішчы ўдалося крыху палепшыць.

У другім савгасе Дурынічы, Бабруйскай акругі «загадчык,—піша практыкантка,—на працягу 3-х месяцаў ня плаціць пэнсіі; адносіны дрэнныя. Адразу загадчык спаткаў мяне словамі: «на якога чорта вас трэст прысылае, вы зусім мае непатрэбны».

Аб усіх гэтых ненармальных зьявішчах вытворчая камісія давала да ведама Белсельтрэсту, які патрабаваў ад загадчыкаў зьмяніць свае адносіны да практыкантаў.

Як-жа зьвяшчаюць гэтыя ненармальнасьці загадчыкі савгасаў? Аб гэтым піша практыкантка з савгасу Дурынічы. „Чаму вы зрабілі мне такую вялікую няпрыемнасьць? Трэст-жа прыслаў паперу загадчыку, каб ён заплаціў мне належачую суму грошай. Ён выклікаў мяне, агаласіў паперу і сказаў: **сьвінства з вашага боку, грамадзянка, скардзіцца ў трэст, намякнуў, што гэта мне так ня пройдзе, і тут-жа запатрабаваў, каб я на адвароце напісала, што поўнасьцю атрымала грошы.** І што вы думаеце, я напісала, што атрымала поўнасьцю і што супроць загадчыка нічога ня маю. Гэта-ж няпраўда, але ў мяне ня было выхаду, бо мне і так нялёгка жывецца, а тут яшчэ гэта няпрыемнасьць».

Досыць ясна, якую можа атрымаць карысьць практыкант пры гэткіх умовах працы і гэткіх адносінах да яго з боку кіраўніка прадпрыёмства. Трэба належным органам ужыць меры, каб зьвяшчыць гэтыя ненармальныя зьявішчы.

Студэнт Лагуценка.

Белжылсаюзаўская гульня.

Студэнцтва знаходзіцца ў надзвычайна цяжкіх жыльлёвых умовах. Студэнцкіх інтэрнатаў далёка не хапае, каб зьмясьціць хоць-бы ўсіх студэнтаў-стыпэндыятаў. Напрыклад, у БДУ з 1.000 стыпэндыятаў мае месца ў інтэрнаце толькі 450 асоб, а ўсяго-ж на унівэрсытэце каля 3.000 студэнтаў! Пераважная большасьць студэнцтва жыве на прыватных кватэрах.

Штогод жыльлёвы крызіс студэнцтва ўсё больш абвастраецца.

Улічваючы гэта, Менскі Гарадзкі Савет пастанавіў забраніраваць за студэнтамі ўсю займаемую імі жыльлёвую плошчу ў камгасаўскіх і жактаўскіх будынках, а таксама ў прыватных у ліку 30 проц. нормы, з тым, каб гэта плошча, пасьля выезду якога-колечы студэнта, засялалася па ордэрах адпаведных студэнцкіх арганізацый.

Шмат прыходзілася прадстаўнікам студэнцкіх арганізацый весьці барацьбу з кіраўнікамі камгасаўскіх будынкаў за кожны асобны пакой, каб выконвалася гэта пастанова. Толькі пасьля далатковай пастановы Гарсавету ад 2 лютага г. г. студэнт у камгасаўскім будынку жыве больш-менш спакойна.

На жыльлёвым фронце, апрача кіраўнікоў камгасаўскіх будынкаў,—ёсьць больш вялікі «вубр»—гэта Белжылсаюз. Апошняму адно слова студэнт не дае спакою. Бачыце, студэнты ў жактаўскіх пакоях—„публина не рентабельная", некалькі капеек—вось і ўся кватэрная плата. Белжылсаюз паранькуй выжыць студэнтаў са сваёй гаспадаркі, і гэта ён праводзіць са ўсёй рашучасьцю. Калі выяжджае адзін студэнт, дык другога ўжо ня пушчаюць. Ня гледзячы на вышэйпаманёную пастанову, яшчэ ў мінулым годзе Белжылсаюз пасылае «ультыматум» у ЦБ пралетарскага студэнцтва, у якім просіць, каб ня было непаразуменьняў, не выдаваць ордэраў на студэнцкія пакоі, бо пасьляўшыяся на ім будуць разглядацца як самавольна (?) захапіўшыя жыльлёвую плошчу, і ў адносінах да іх „будут приниматься меры, допускаемые действующим законодательством", а назаўтра прыступае практычна да выкананьня свайго абяцаньня—высялае студэнтак музтэхнікуму Любан і Калёсьнікаву.

Белжылсаюз, прымушаны браніраваць студэнцкую плошчу, пачынае „мудрствовать" і ў сваім абежніку жактам растлумачвае, што гэта пастанова адносіцца толькі да студэнтаў-стыпэндыятаў і беспрацоўных; апрача гэтага БЖС даводзіць, што «незалежна ад гэтага неабходна вытвараць здавальненьне жыльлёвай плошчаю студэнцтва на агульных падставах у парадку чаргі і заву паступаючых у Жакт!..

Мы ня зьбіраемся гаварыць аб апошніх прыгожых словах, мы добра разумеем, што аб выкананьні іх і марыць няма чаго, а вось наконт броні плошчы, дзе жывуць студэнты, прымушаны нават крычаць. Штодзень у студэнцкія арганізацыі прыходзяць студэнты з паведамленьнем аб недапусьціўшым парушэньні жактамі пастановы Гарсавету.

Шэраг жактаў ідуць яшчэ далей з БЖС, яны зусім не прызнаюць студэнцкай плошчы нават і ў адносінах да стыпэндыятаў і беспрацоўных.

Напрыклад, з жактам № 48 прыходзілася студэнтцы судзіцца, і зараз, ня гледзячы на пастанову суда, справа з квартэрнай платай не ўрэгулявана, яна плоціць гаспадару кватэры па ўмове.

У жактах 23 і 13 толькі пасьля 1 з пал. месячнай палакіты з дапамогай пракуратуры ўдалося ўсяліць студэнтак у студэнцкі пакой.

Жакт № 12 здаў зусім студэнцкі пакой па свайму погляду.

Жакт № 2, дзе жыў студэнт-беспрацоўны, а таксама жакты № 21, 15, 18 зусім не жадаюць прызнаваць студэнцкай плошчы.

Штогод пры БДУ пакідаецца каля 50 студэнтаў для прахаджэньня стажу на гадавы тэрмін, пасьля чаго накіроўваюць іх на працу. Такі гэтых студэнтаў БЖС выключае з ліку броні, бо ня лічыць стажораў студэнтамі.

Так цьвёрда трымае Белжылсаюз курс на выжываньне студэнтаў з жактаўскіх будынкаў. Студэнцкая плошча паступова зьмяншаецца. Зараз, у сувязі з новым прыёмам, студэнцтва апынулася ў надзвычайна цяжкім жыльлёвым становішчы, а БЖС у апошні час упарта пераходзіць у наступленьне.

Бюракратызм, неграмотнасьць, па форме і па сутнасьці зьлезк—вось, што пануе ў гэтай справе.

У гэту справу павінны ўмяшацца адпаведныя органы, каб спыніць гэта самавольства.

Белжылсаюз трэба прызваць да парадку.

ЛЬВОВІЧ.

Курсы падрыхтоўкі рабочых у ВНУ.

У мінулым годзе па ініцыятыве камсамольскай ячэйкі БДУ былі арганізаваны пры унівэрсытэце кароткатэрміновыя курсы па падрыхтоўцы рабочай моладзі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, тэхнікумы і рабфакі. На курсы было прынята звыш 300 асоб, значная частка з якіх зараз паступіла ў шэрагі студэнцтва.

Улічваючы добры вопыт мінулага году, зараз пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце арганізуюцца сталыя курсы па падрыхтоўцы рабочых у ВНУ і рабфакі. Тэрмін навучэньня на курсах будзе гадавы; заняткі будуць праводзіцца тры разы ў тыдзень. Ужо шэраг маладых рабочых зварачваецца да арганізатараў з просьбай аб залічэньні іх у слухачы. Усяго на курсы будзе прынята 200 слухачоў, з якіх 100 на аддзяленьне па падрыхтоўцы ў ВНУ і 100—па падрыхтоўцы на рабфакі.

На курсы будуць прымацца выключна рабочыя з прадпрыёмстваў і 10 проц. па рабкоў і чырвонаармейцаў па камандыроўках райкомаў ЛКСМ і фабзавкомаў.

Зараз праводзіцца падрыхтоўчая праца да іх адчыненьня; у хуткім часе пачнуцца заняткі. Курсы будуць абслугоўваць студэнты унівэрсытэту ў парадку грамадзкай працы. Настаўніцкі склад камплектуецца са студэнтаў апошніх курсаў педфаку і скончэўшых сёлета унівэрсытэт.

Мяркуецца гэткіх-ж курсы адчыніць і пры Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі і Віцебскім Ветэрынарным Інстытуце.

На аддзяленьне па падрыхтоўцы ў выш. навуч. установы будуць прымацца асобы, маючыя адукацыю ня менш сямігодкі.

Праца па падрыхтоўцы рабочай моладзі ў навучальныя ўстановы вяўляецца адным з новых відаў грамадзкае працы студэнцтва сярод рабочых мас; гэтаму пытаньню студэнты аддаюць вялікую ўвагу. Т. Г.

Перавыбары студэнцкіх арганізацый.

З 1-га кастрычніка пачаліся перавыбары студэнцкіх арганізацый БССР, а таксама беларускіх зьмяцтваў у Маскве, Ленінгразе і Кіеве. У працу студэнцкіх арганізацый уносіцца некаторае спрашчэньне. У бягучым годзе на грамадзка-кіраўнічую справу студэнты будуць абірацца толькі на адзін год. Гэта дасьць магчымасьць упягнуць новыя кадры студэнцтва ў актыў і палепшыць акадэмічную пасьпяховасьць. Студэнты першых і апошніх курсаў усіх навучальных устаноў будуць поўнасьцю аслабанены ад грамадзкай працы.

ПРА ЭКСПАРТ ГАРОДНІНЫ І САДАВІНЫ

У сучасны аднаўленчы пэрыяд нашая прамысловасьць і сельская гаспадарка з году ў год прад'яўляюць усё большыя і большыя патрабаваньні да імпарту рознага абсталяваньня некаторых відаў сыравіны і поўфабрыкатаў.

Пакуль чужаземны капітал не ўліў выгаднасьці доўгатэрміновага крэдытаваньня заказаў Савецкага Саюзу спрабуе скарыстаць крэдыты ў якасьці палітычнага націску на наш Саюз Савецкіх Рэспублік, адзінай крыніцай павялічэньня імпарту зьяўляецца пашырэньне экспарту.

За мінулы год экспарт БССР даў начнае павялічэньне—з 7,1 млн. у 926-27 г.—да 12 млн. руб. золатам 1927-28 г. Аднак, нельга сказаць, што ўсе нашы магчымасьці да экспарту выкарыстаны. Маецца яшчэ шэраг галін, якія ня ўцягнуты ў экспарт.

Такімі галінамі, у прыватнасьці, зьяўляюцца гародніна, садовіна і гады.

Гэтыя другарадныя віды гаспадаркі часу імпэрыялістычнай вайны да гэтага часу з БССР за межы ня вывозіліся, між тым, пры большай увазе да іх разьвіцьця за іх кошт можам выручыць значную колькасьць валюты.

Пяройдзем да разгляду асобных прадстаў.

Гародніна. Замежны рынак прад'яўляе вялікі попыт на сьвежую гародніну. Досыць сказаць, што адна Германічна штогод імпартуе толькі на гэты пэрыяд больш чатырох мільёнаў. Заработная Мільёнамі пудоў увозіцца павялічылася гародніна, як цьвяртаэрныя агуркі сьвежыя, морква і інш. Апроч Нямеччыны, увозяць гародніну яшчэ і іншыя краіны. Для нас, апроч Нямеччыны, можа быць рынкам збыту яшчэ і Рыга, як найбольш блізкі і выгадны пункт у адносіне транзіту.

Некаторыя краіны, як, напрыклад, Галандыя, спэцыяльна прыстасавалі сваю гаспадарку для масавай вытворчасьці і экспарту сьвежай гародніны. Беларусь гародніны амаль яшчэ не экспартуе, а між тым геаграфічны стан Беларусі такі, што транзітныя ўмовы, г. зн. блізкасьць рынкаў збыту, дае магчымасьць арганізаваць вывоз сьвежай гародніны. У мінулым годзе пачалі вывозіць цыбулю, і вопыт даў вельмі добрыя вынікі, толькі цыбуля ў нас разводзіцца яшчэ ў нязначнай колькасьці. Іншую гародніну, як цвятную капусту, агуркі, моркаву таксама з посьпехам можна рэалізаваць. Але і тут мы маем нездавальняючае разьвіцьцё разьвядзеньня ў нас гародніны.

Нам трэба ўзмацняць разьвіцьцё гэтай справы, як найбольш рэнтабельнай.

Каб больш пасьпяхова разводзіць гародніну, трэба карыстацца вопытам кантрактацыі, галоўным чынам, на мястэчках. З часам гародніна павінна заняць найбойнейшае месца ў экспарце. Адначасова яна дасьць значную крыніцу прыбыткаў для жыхарства.

У мястэчках і ваколіцах гарадоў трэба зараз-жа павесьці кампанію за арганізацыю гародных таварыстваў, якія займуцца справай дастаўкі насельня, будуць даваць патрэбныя ўказаньні і наладзяць збыт гародніны.

Ня менш важна і востра стаіць пытаньне і аб узмацненьні дастаўкі гародніны на ўнутраныя рынкі нашых гарадоў. У параўнаньні з Заходняй Эўропай у нас у шмат разоў менш спажываюць гародніны і вельмі многа ўжываюць хле

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

аб зьмене § 4 пастановы Эканамічнай Нарады за 11-VI-1928 г. аб парадку водпуску лесу ў 1928-29 годзе.

Эканамічная Нарада БССР, у адпавядзенасьці з пастановай Савету Народных Камісараў БССР за 19 верасьня 1928 г., пастанаўляе:

1. Пункт 4 пастановы Эканамічнай Нарады за 11 чэрвеня 1928 г. адмяніць і замяніць яго наступным:

«Адзенка драўніны, адпушчаемай сельскаму насельніцтву, калектыўным гаспадаркам робіцца па таксах 1924 года наступным парадкам:

а) 85 проц. гаспадарак і ўсім калектыўным гаспадаркам—без гандлёвай надбавы;

б) 15 проц. гаспадарак больш заможных, кіруючыся пры гэтым матар'ялам па абкладаньню с.-г. падаткам, з надбавай на таксу 1924 г.: на драўніну з лесасек і земельнага фонду 100 проц., на сьвежы буралом і ветравальны лес—60 проц., на сухастойны лес—20 проц.

Даручыць акруговым выканаўчым камітэтам ужыць захады да вынаўленьня гаспадарак па вышэй паказаных групах да моманту разьмеркаваньня драўніны насельніцтву.

Вып. аб Старшыні Эканамічнай Нарады пры СНК БССР С. Карп.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР В. Крывіцкі.

28 верасьня 1928 году.
г. Менск.

Постановление

Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР

об отмене § 4 постановления Экономического Совещания от 11-VI 1928 года „О порядке отпуска леса в 1928-1929 году".

Экономическое Совещание БССР, в соответствии с постановлением Совета Народных Комиссаров БССР от 19 сентября 1928 года постановляет:

1. Пункт 4 постановления Экономического Совещания от 11 июня 1928 года отменить и заменить его следующим:

«Оценка древесины, отпускаемой сельскому населению, „коллективным хозяйствам производится по таксам 1924 года следующим порядком:

а) 85 проц. хозяйств и всем коллективным хозяйствам—без торговой надбавки;

б) 15 проц. хозяйств более зажиточных, руководствуясь при этом материялами по обложению сельхозяйственным налогом, с надбавкой на таксу 1924 года: на древесину с лесосек и земельного фонда 100 проц., на свежий буерал и ветровальный лес—60 проц., на сухостойный лес—на 20 проц. Поручить окружным исполнительным комитетам принять меры к распределению хозяйств по выше указанным группам до момента распределения древесины населению.

Исп. обяз. председателя Экономического Совещания при СНК БССР С. Карп.

Зам. управляющего делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР В. Кривицкий.

28 сентября 1928 г.
г. Минск.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

пра непадачу арганізацыямі Народнаму Камісарыяту Гандлю вестак па хлебных і сыравінных апэрацыях.

Эканамічная Нарада пры Савеце Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць т. т. Наўляннокага і Акоючыца накласьці адміністрацыйнае спагнаньне за несвачасовую падачу зьвестак па хлебных і сыравінных апэрацыях на наступныя арганізацыі:

а) Па лініі спажывецкай кааперацыі:

Барысаўскае аддзяленьне БКсаюзу, Бабруйскі саюз, Віцебскі саюз, Мазырскае аддзяленьне Гомельскага саюзу, Віцебскі, Магілёўскі і Полацкі центральныя рабочыя кааператывы.

б) Па лініі сельска-гаспадарчай кааперацыі:

Мазырскі, Віцебскі і Полацкі саюзы.

2. Перасьцерагчы Белкавасаюз, Белсельсаюз і іншыя арганізацыі, якія не падалі своечасова вестак, што ў выпадку паўторнай непадачы зьвестак—Народным Камісарыятам Гандлю справы павінны быць безадкладна накіраваны Пракурору для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Вып. аб Старшыні Эканамічнай Нарады пры СНК БССР С. Карп.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР В. Крывіцкі.

1 верасьня 1928 г.
г. Менск.

ПАД ЛЁЗУНГАМ ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ.

Сэкцыя спэцыялістаў пры ЦП саюзу зямельных і лясных працаўнікоў пастанавіла, што ўсе спэцыялісты па сельскай гаспадарцы павінны правесьці вялікую агітацыйную працу ў дзень „Сьвята ўраджаю". У гэты дзень трэба ня толькі прадэманстраваць усе нашы дасягненьні ў галіне сельскай гаспадаркі, але трэба выступаць з дакладамі аб павялічэньні ўраджайнасьці уважліва прыслухоўваючыся да практычных заўваг сялянства па гэтаму пытаньню. Поруч з гэтым спэцыялісты павінны на сходах, прысьвечаных сьвяту, паказаць сялянству перавагу калектыўнага і савгаснага зямлякарыстаньня над дробным, абгрунтоўваючы гэта дыяграмамі ды іншым лічбавым матар'ялам.

Экспартныя навіны.

○ Белдзяржгандаль закончыў экспарт брусьніц. Экспартавана 45 вагонаў гэтых ягад. З заграничных фірм ёсьць яшчэ цэлы шэраг заказаў на брусьніцы.

○ У верасьні ўпяршыню в Беларусі экспартавана некалькі вагонаў галяндзкага сыру вытворчасьці Белсельтрэсту. У кастрычніку мяркуецца накіраваць яшчэ некаторую колькасьць сыру.

○ Пачалася кампанія па экспарту яблык. Першыя партыі ўжо адасланы заграніцу. Яблыкі загатоўлены па заданьню Белдзяржгандлю Белсельтрэстам і Белсельсаюзам.

○ У бліжэйшыя дні экспартуецца заграніцу ў Нямеччыну 2 вагоны плаўленай крэйды. Гэта зусім новы від тавару, які да гэтага часу ня вывозіўся. Крэйда загатоўлена і перапрацавана ў Касьцюковіцкім раёне.

Пэнсія навуковым працаўнікам.

Міжведамсьцьвенная камісія пры Нар.Кам. Сацыяльнай Забясьпечкі БССР прызначыла пэнсію: праф. Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі Колоколову—125 руб. у месяц, праф. БДУ Шарынаву—125 руб. у месяц, навуковаму супрацоўніку Віцебскага аддзяленьня Белдзяржмузэю Красьнянскаму—70 руб., загадчыку этнаграфічнага аддзелу і архіву Белдзяржмузэю Папову—90 руб.

Апрача гэтага прызначана пэнсія ў суме 62 руб. 50 к. жонцы памёршага беларускага вядомага этнографа Раманава, сям'і памёршага праф. Дзяржаўнага Вэтінстытуту Прозарава—125 руб. у месяц і жонцы памёршага выкладчыка Беларускай Сельска-гаспадарчай Акадэміі Биссонова—55 р.

Прафарганізацыі рыхтуюцца да зімы.

(Барысаўскі цэнтральны рабочы клюб).

Барысаўскія прафесыянальныя арганізацыі ня маюць сваіх клюбаў. Усе члены прафарганізацый вынаўляюцца членамі цэнтральнага рабочага клюбу.

У праўленьне клюбу ўваходзяць прадстаўнікі ад усіх буйных прафсаюзаў і прадпрыемстваў.

Пры такім становішчы павінна была-б культурная праца весьціся на ўсе 100 пр. Але-ж што мы назіраем у сапраўднасьці?

Клюб перажывае матар'яльны крызіс. Дагэтуль клюб атрымліваў ад райпрафбюро 400 руб. А сёлета, у сувязі з ліквідацыяй некаторых прафсаюзаў і групкомаў, прафсаюзы ня маюць магчымасьці асигнаваць належнай колькасьці сродкаў на культпрацу.

Гэта пытаньне прымусіла праўленьне клюбу паставіць пытаньне перад гарадзкім саветам, каб апошні перавёў рабклюб у свой каштарыс.

Праўленьнем клюбу прадстаўлен быў каштарыс у суме 400 руб. штомесячна для аплаты тэхнічнага штату, на выпіску газэт, кніг, на штомесячнае абслугоўваньне канфэрэнцый, пасяджэньняў, рэлігійных сьвятаў і г. д.

Але-ж гарадзкім саветам адпушчана ўсяго 140 руб. А рэшта патрэбных сродкаў дзе ўзяць? Робяцца платныя пастаноўкі, канцэрты, экспляатуецца заля клюбу, скарочан штат. Скарочаны кіраўнікі двох гурткоў—яўрэйскага і расейскага.

Праца гэтых гурткоў пераведзена на самакіраўніцтва і самаактыўнасьць гурткоўцаў. Яўрэйскі драмгурток працаваў лепш, чым пад кіраўніцтвам сталага кіраўніка, але-ж гэта таму, што гурток гэты існуе доўгі час. Гурток гэты мае такіх таварышоў, якія могуць самастойна кіраваць дрампрацай.

З расейскім-жа гуртком справа абстаяла дрэнна, і ён здразу разваліўся.

У адносінах беларускай мовы амаль што нічога ня зроблена. Кніжак беларускіх у бібліятэцы вельмі мала.

Гарадзкі камітэт партыі мае спэцыяльны куток для агітацыйна-прапагандысцкай працы, але яго слаба наведваюць і шмат кніжак амаль што не праглядаецца.

Слаба разгортваецца праца гурткоў, мала арганізавана вечароў запытаньняў і адказаў, мала налажваецца вечароў, прысьвечаных культурнай рэвалюцыі, мэдычнай дапамозе.

Юнацкая сэкцыя клюбу, якая абслугоўвае ўсю рабочую моладзь, павінна больш узмацніць працу. Павінен быць арганізаваны пры клюбе гурток для ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослых рабочых. Неабходна ўлягчыць большую колькасьць рабочых у актыўную працу клюбу.

У сучасны момант, калі клюб пераводзіць усю сваю працу з летняга саду ў сталае зімовае памяшканьне, праца гурткоў, як палітычных, так і прафесыянальных, павінна быць узмоцнена.

Рабкоры і юнкоры павінны рэгулярна выпушчаць вусную газэту і сьцевавыя газэты.

Насьценная газэта павінна быць выпушчана ня толькі на яўрэйскай, але і на беларускай мовах.

П. К.

ХРОНІКА.

ПРАЭКТ РЭФОРМЫ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАПІСУ ХУТКА БУДЗЕ ЗАКОНЧАН.

Гэтымі днямі Акадэмічная Рада Інбелкульту заслухала справаздачу старшыні правапіснай камісіі т. Некрашэвіча аб ходзе працы па раформе беларускага правапісу.

З дакладу выявілася, што правапісная камісія ў першую чаргу занята апрацоўкаю беларускага правапісу, адклаўшы рэформу азбукі на другую чаргу.

Да гэтага часу апрацаваны правапіс галосных, правапіс зычных і блізка да скончэньня правапісу канчатковых. Зараз правапісная камісія распрацоўвае правапіс чужаземных слоў і ўласных іменьняў.

Акадэмічная Рада прызнала працу правапіснай камісіі здавальняючай і ўстанавіла канчатковы тэрмін прадстаўленьня праэкту 1-е студзеня 1929 г.

Побач з пытаньнем правапісу камісія падрыхтоўвае матар'ял для артаграфічнага беларускага слоўніка.

У аснову праэкту раформы беларускага правапісу будзе пакладзены правапіс, якім зараз карыстаецца газэта «Савецкая Беларусь».

У Менск прыяжджаюць удзельнікі лёдавага паходу праф. Візэ, лётнік Бабушкін і кіна-апэратар Валентэ.

На днях Цэнтральны Савет ТДА-Авіяхіму ССРС і Маскоўскі камітэт Чырвонага Крыжу наладжваюць у Менску вечар удзельнікаў лёдавога паходу савецкага лёдаколу «Малыгін».

На вечары з дакладамі выступяць начальнік экспэдыцыі праф. Уладзімер Юльевіч Візэ, лётнік Міхаіл Сяргеевіч Бабушкін, кіно-апэратар экспэдыцыі І. А. Валентэ. Даклады будуць адбывацца з дэманстрацыяй сьветавых карцін і кіно-фільмы з тлумачэньнямі тав. Валентэ, якім зазьнята гэта экспэдыцыя.

Тэма кіно-лекцыі—паход Малыгіна.

Сабраныя сродкі ад вечару пойдуць на карысьць «Камітэту Дапамогі дырыжабля «Італія» і Амундсэну.

Чырвоныя байцы варочаюцца з летняй вучобы.

У нядзелю, 7-га кастрычніка, а 11-й гадзіне раніцы зьвяртаюцца з летняй вучобы кавалерыйскія часьці 4-скай дывізіі.

Рыхтуецца ўрачыстая сустрэча.

Менскія рабочыя праводзяць зборы на падарункі, якія яны падносяць сваім падшэфным часьцям.

У надзелю ўвечары шэфамі будуць арганізаваны ў рабочых клюбах вечары сустрэчы з Чырвонай арміяй.

Хлебазагатоўкі праходзяць пасьпяхова.

За верасень м-ц па Менскай акрузе загатоўлена хлеба: ад сялян—272 тоны, ад памольнага збору—522 тоны, ад савецкіх гаспадарак—1284 тон, ад калгасаў—44 тоны.

Агульнае заданьне па розных хлебапрадуктах за верасень месяц выканана на 102 проц.

Льна-семені загатоўлена за верасень па Менскай акрузе—125 тон., г. зн. 254 проц. заданьня.

Дэфіцытныя прамтавары для БССР.

Нар. Кам. Гандаль СССР выдзеліў на 1-шы квартал бягучага гаспадарчага году для БССР наступную колькасьць дэфіцытных прамтавараў: баваўнянай тканіні—145 вагонаў, суконных тавараў на суму каля 650.000 руб., скураных тавараў — на 560.000 руб. і абутку—на 500.000 руб.

Размеркаваньне гэтых тавараў будзе ў хуткім часе зроблена.

Каапэрацыйныя курсы.

15-га кастрычніка адчыняюцца 7-мі-месячныя каапэрацыйныя курсы для служачых Менскага Цэрабкопу.

Заняткі будуць адбывацца 3 разы ў тыдзень. На курсах будуць чытацца лекцыі аб таваразнаўстве, тэхніцы гандлю і г. д.

Курсы разьлічаны на 80 слухачоў.

Мэта курсаў—перакваліфікацыя служачых.

Загатоўка гародніны.

Белрабсакцыя адпусьціла для пасьпяшнага правядзеньня загатовак гародніны 215.000 руб. для ўсіх Цэрабкопаў БССР.

Больш буйныя сумы адпушчаны Менскаму ЦРК—65.000 руб., Віцебскаму—45.000 руб., Гомельскаму—35.000 руб., Магілеўскаму і Бабруйскаму цэрабкопам адпушчана на 17.000 руб.

Шкоднікі папсаавлі азіміну.

Менскі Акрэв атрымаў паведамленьне што ў Бягомльскім раёне шкоднікам—азімая соўка папсавана 60 гэкт. азіміны. Для перасеву пасутага жыта ў гэты раён накіроўваецца 600 пуд. насеньня.

Доўгатэрміновы крэдыт на бульбу.

На нарадзе ўпаўнаважаных Менскага Цэрабкопу быў выпрацаван парадак водпуску пайшчыкам у доўгатэрміновы крэдыт бульбы.

Крэдыт будзе выдавацца на 4 месяцы. Кожны пайшчык будзе атрымліваць ад 9 да 21 пуд. бульбы. Бульба будзе даставляцца пайшчыкам на дом.

У фонд абароны краіны.

За час з «Тыдню абароны» да 1-га кастрычніка ў Менскі акрсавет ТДА-Авіяхіму паступіла ў фонд абароны краіны 7.998 руб. 95 к.

Больш усяго сабралі ў фонд абароны краіны ячэйкі ТДА-Авіяхіму «Бальшавік»—450 руб. і страйкому васпеду—432 руб.

Паступленьні ў фонд абароны краіны ад розных ячэек ТДА-Авіяхіму г. Менску і і райсаветаў ТДА-Авіяхіму акругі прадаўжаюцца.

Трохдзёньнік дапамогі сялянным.

З 15-га па 18-га кастрычніка па Менску будзе праводзіцца трохдзёньнік дапамогі сялянным.

У гэтыя дні на прапрыемствах і клюбах адбудуцца лекцыі па бараньбе з сьцепотай. Гэтыя лекцыі азнаёмяць працоўных з тым, як можна ахаваць себя ад сляпаты.

Агульна-гарадзкая канфэрэнцыя клюсных працаўнікоў.

Прэзыдыум ЦСПСБ склікае ў хуткім часе агульнагарадзкую канфэрэнцыю, у якой прымуць удзел культкамісіі фабкомаў, загадчыкі клюбаў і інш. На канфэрэнцыі будуць заслуханы даклады па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод сяброў прафсаюзаў, культурным паходзе камсамолу і аб масавай працы ў клюбах.

Уцягненьне дарослых рабочых у клюбы.

Пашыраная нарада пры культаддзеле ЦСПСБ абгаварыла пытаньне аб уцягненьні дарослых рабочых у клюбы.

У сувязі з перавыбарамі праўленьняў клюбаў вырашана падняць кампанію па вярбоўцы рабочых у клюбы. З гэтай мэтай будуць праведзены справаздачы членаў праўленьняў клюбаў на прадпрыемствах, дзе пасьля сходу будзе праводзіцца запіс у сябры клюбу. Мяркуецца таксама праз друк наладзіць выклікі асобных устаноў, прадпрыемстваў, цэхаў, груп рабочых і г. д. У час кампаніі будуць наладжаны інсэніроўкі судоў над несябрамі клюбу. Вярбоўка рабочых у сябры клюбаў будзе праводзіцца да студзеня 1929 г.

100 швэйных машын з Амэрыкі для фабрыкі „Меншвэй".

Атрымана паведамленьне з Адэсы, што в Амэрыкі прыбыло 100 швэйных машын. Апошнія будуць устаноўлены на фабрыцы «Меншвэй». Гэтыя машыны будуць прыводзіцца ў рух электрычнасьцю.

Установка гэтых машын дасьць магчымасьць механізаваць швэйную прамысловасьць БССР.

Зачыненьне летняга спартыўнага сэзону.

15-га кастрычніка ў Менску адбудзецца зачыненьне летняга спартыўнага сэзону.

У памяшканьні цырку адбудзецца вялікі фізкультурны вечар. У праграму вечару ўваходзіць барацьба, нумары на скарадах і г. д.

Усе сродкі пойдуць на арганізацыю катка на спартыўнай пляцоўцы ў садзе «Прафінтэрн».

Бяспрытульная вуліца.

На старонках газэт пираз ужо пісалася аб становішчы Стара-Слабадзкой вуліцы. Але мусіць, камгасу гэта на тычыцца. Па Стара-Слабадзкой вуліцы, як і раней, немагчыма прайсьці, Пара ўжо камгасу направіць вуліцу, а заадно і электрычнасьць правесьці, бо жыльцы ходзяць з лямпамі ў «Эльвод» 4 месяцы.

Шахматы № 21.

Пад рэдакцыяй А. Каспэрскага.

Задача М. Штэйна—Менск.



Бел. Крb2, Cd8, Kb4 і f4 пп: a4, b3, d6, f2, f3, g2 і g4 (...11).

Чорн. Кр d4... (1).

Мат у 3 хады.

ЧАЦЬВЕРТЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ШАХМАТНА-ШАШАЧНЫ ЗЬЕЗД.

Сёньня а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу Карла Маркса—урачыстае адчыненьне зьезду. У працы зьезду прыме ўдзел звыш 150 асоб.

У праводзімых спаборніцтвах прыдзе ўдзел звыш 100 ігракоў.

Будуць праведзены:

1) Чэмпіянаты БССР па шахматах і шашках;

2) Камандныя спаборніцтвы ад акругаў БССР да 10 команд па 5 ігракоў.

3) Шахматны чэмпіянат-турнір звыш—прыме ўдзел 10-15 ігракоў.

Такога шматлюднага зьезду ніяко ў БССР ня было.

Чэмпіянат па шахматах.

Удзельнічаюць на ў конкурсе майстэр Раманоўскі і Модаль—Ленінград, Варшаўскі ці Дуз-Хаціміроскі—Масква і старэйшы ігрок першае ўсесаюзнае катэгорыі Вашчыкаў—Смаленск.

Змагацца за чэмпіянат БССР будуць ад Менскае—Гаухберг, А. Каспэрскі, Шэнтель; Шукэвіч-Траецянкоў, ад Віцебска Блюмберг, Гонман, Сліч і Тышлер, ад Гомлю; Манэвіч і Ноткін, ад Магілёва Стаяўскі і ад Вабруйску- Гуровіч.

Чэмпіянат па шашках.

Акрамя лепшых ігракоў па БССР, прыдуць удзел 5 майстроў: Гардон 1.—Менск, Міроцін—Гомель, Гінзбург—Масква, Гардон і Гардон С.—Ленінград.

Прыяжджаючыя разьмяркоўваюцца ў залі «Эўропа», Пляц Волі.

4-Х прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў утрыманьне далегатаў на ўвесь час зьезду пакінуць на кошт адпаведнага саюзу.

Гульня будзе адбывацца ў клюбах—Красноармейскі і Сакрадальскі служачых.

Першы тур—заўтра ўвечары.

Справачны аддзел.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

НА 6-X-1928 г.

Абл. 1 дзярж. паз. — прад. 4—76,5, куп. 4—74,5.

Абл. 2 дзярж. паз.—прад. 5—13, куп. 5—11.

Абл. 3 сял. паз.—прад. 5—2, куп. 5—00.

Абл. 10 пр. паз. 27 году — прад. 25,44, куп. 25—34.

Абл. дзярж. паз. 26 г. — прад. 122, куп. 120.

Абл. 12 пр. дзярж. паз. прад. 104—22 куп. 104—17.

Абл. 6 пров. паз. індустр. прад. 24—84,5, куп. 24—74,5.

Апавяшчэньне

ДОМ АСЬВЕТЫ.

У пятніцу, 8-га кастрычніка—маставкі нямецкі фільм „Небясьпечны ўзрост" у 7 частках з удзелам вядомых артыстаў Паўла Вегенера і Нэты Нольсен.

Паштовая скрынка.

Аўтарам, допісы якіх пакіраваны на рассьледваньне:

1) «Хто далажэ»—аб судзе бэтрачы пракурору Менакруг;

2) «Борисовская Биржа» Труда»;

3) «Во, гэта дык гаспадар»—У Менскі акруговы РСІ,

4) „Дачка абшарніка на працы"—у Гомльскі РВК і адбітак.

5) „Ратуйце ад злодзеяў"—Пяч. Крмін. Вышку Менакруг.

6) «Вось гонар кулака»—Лягойскі РВК.

7) «Вялікіцкі жаніх» — у Барысаўскі РВК.

БОЛІНУ. Барысаў. Сёлетняя раённая канфэрэнцыя асьветнікаў мацуе перавагу мэтадычна-вытворчы характар. Пазначаны яны якраз і адыгрываюць ролю тых ці рыктоўных нарадаў, якія вы прапануеце артыкуле «Неабходна правесьці вытворчы нарады". Артыкул „За ажыцьцяўленьне комплексай сыстэмы" пойдзе ў чарговы нумары «Працаўніка Асьветы».

Часова вып. абав. адказнага рэдактара

П. ШАСТАКОЎ.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

БАБРУЙСКАГА АКРУГОВАГА КАМУНАЛЬНАГА ТРЭСТУ

(Бабруйскі Акркамунтрэст і быўш. СЛУЦКІ ТРЭСТ Мясцовай Прамысловасьці)

АКТЫЎ. за 1926-27 год. ПАСЫЎ.

№№ разьдз.	НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА Прыватная	СУМА Агульная	%	%
I	МАЁМАСЬЦЬ.				
	1. Будынкі і пабудовы	724603—06		45,29	
	2. Абсталяваньне і машыны	706678—78		44,17	
	3. Інструменты	11077—91		0,69	
	4. Інвэнтар	35737—75		2,24	
	5. Запасныя абсталяваньні	74528—29		4,66	
	6. Дажэнка маёмасьці	917—19		0,06	
	7. Зьмены статутнага капіталу	8966—80		0,57	
	8. Пабудоўка і набыцьцё маём.	31301—63		1,95	
	9. Капітальныя рамонты	5902—45	1599713—86	0,37	55,69
				100	
II	МАТАР'ЯЛЫ.				
	10. Сыравіна і аснаўн. матар'ялы	108751—25		31,63	
	11. Апал	72008—56		20,94	
	12. Дапаможныя матар'ялы	30004—28		8,73	
	13. Прадметы ўжытку	8775—81		2,55	
	14. Рамонтна-будаўнічы. матар.	33074—72		9,62	
	15. Электрычн. матар'ялы	33857—63		9,85	
	16. Розныя матар'ялы	4620—95		1,35	
	17. Матар'ялы ў дарозе	922—29		0,27	
	18. Загатоўкі тавар. і матар'ял.	51765—69	343761—38	15,06	11.97
				100	
III	НЯСКОНЧАНЫЯ АПЭРАЦЫІ.				
	19. Паўфабрыкаты	96173—70		83,53	
	20. Няскончаныя вытворчасьці	18970—91	115144—61	16,47	4,01
				100	
IV	ГАТОВЫЯ ВЫРАБЫ				
	21. На складах	137155—99		99,25	
	22. На камісіі	1032—50	138188—49	0,75	4,81
				100	
V	ГРАШОВЫЯ СРОДКІ.				
	23. Каса	4918—07		45,76	
	24. Бягучыя рахункі	6320—94	11239—01	56,24	0,39
				100	
	25. Каштоўн. паперы	2098—60		26,35	
	26. Паі і акцыі	5857—62	7956—22	73,65	0,28
				100	
VI	ВЭКСАЛІ І ДАКУМЭНТЫ К АТРЫМАН.				
	27. Вэксалі ў партфелі	5674—14		1,76	
	28. Вэксалі пратэставан.	765—01		0,24	
	29. „ у вучоце	314231—36		96,99	
	30. Наложан. плацяжы	3295—66	323966—17	1,01	11,28
VII	Падсправаздачн. асобы		6627—81	100	0,23
VIII	ДЭБІТОРЫ.				
	31. Рабочыя і служачыя	10955—02		6,49	
	32. Дастаўнікі і падрадчыкі	7351—80		4,36	
	33. Пакупнікі і спажыўцы	118951—56		70,40	
	34. Розныя асобы і ўстановы	15413—40		9,12	
	35. Залогі	10—			
	36. Няпоўная запазычанасьць	16270—89	168952—67	9,63	5,88
IX	Пераходзячыя сумы		47—72		
X	Выдаткі буд. году		15014—52		0,53
XI	Страта мінулага году		141509—70		4,93
	БАЛЯНС		2872142—16		

№№ разьдз.	НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА Прыватная	СУМА Агульная	%	%
I	КАПІТАЛЫ.				
	1. Статутны капітал	996580—57		92,96	
	2. Амартызацыйны	75441—80	1072022—37	7,04	37,
				100	
II	ФОНДЫ І РЭЗЭРВЫ.				
	3. Пагашэньне няпоўнай запазычанасьці	14115—38		21,14	
	4. Зьмены статутнага капіталу	19596—10		29,34	
	5. Іншыя	33073—38	66784—86	49,52	2,
				100	
III	ПАЗЫКІ.				
	6. Пазыкі пад тавары	56068—35		5,9	
	7. Банкі па вучоту	314231—36		33,11	
	8. Доўгатэрміновыя пазыкі	579094—96	949395—17	60,99	38,
				100	
IV	Вэксалі выданыя		243038—86		8,
V	Падсправаздачныя асобы		1473—44		0,
VI	КРЭДЫТОРЫ.				
	9. Рабочыя і служачыя	25616—72		4,76	
	10. Дастаўнікі і падрадчыкі	18840—54		3,49	
	11. Пакупнікі і спажыўцы	90007—21		16,7	
	12. Розныя асобы і ўстановы	403210—98		74,88	
	13. Залогадаўцы	804—41	538479—86	0,15	16,
				100	
VII	Пераходзячыя сумы		947—60		0,
	БАЛЯНС	—	2872142—16	—	—

Дырэктар трэсту ШЭРМАН. Галоўны бухгальтар БУЖАНСКІ.

Рахунак прыбыткаў і страт па Бабруйскаму Акруговаму Камунальнаму Трэсту за 1926-27 год.

СТРАТЫ.

	СУМА Прыватная	СУМА Агульная
1. Агульна накладныя выдаткі	63508—05	
2. Проценты заплачаныя	89770—01	
3. Гандлёвыя выдаткі	64189—35	
4. Зьніжэньні	1533—87	
5. Страта мінул. гадоў, выяўлен. у справаздачным годзе	11547—60	
6. Страта ад безнадзейных даўгоў	7415—71	
7. Адлічэньні у рэзэрв няпоўных даўгоў	2261—50	
8. Розныя страты	21133—65	261359—74
БАЛЯНС		261359—74

ПРЫБЫТКІ.

	СУМА Прыватная	СУМА Агульная
1. Прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі	21584—16	
2. » » водпуску »	23091—42	
3. » » перапрацоўкі і розных дапаможных вытворч. апэрацый	16312—47	
4. Прыбытак ад эксплёатацыі	27374 —	
5. » » ліквідацыі маёмасьці	146—36	
6. Проценты атрыманыя	12731—02	
7. Розныя прыбыткі	18660—61	119850—
8. Страта (сальдо за справазд. год)		141509—
БАЛЯНС		261359—

Дырэктар трэсту ШЭРМАН. Галоўны бухгальтар БУЖАНСКІ.

Заключны баляно разгледжан і зацьверджан Баляносавай Камісіяй Бабруйскага АКРФА (Пратакол № 1 ад 14-III—28 г. і к апублікаваньню для свае выніх чаей працы

Старшыня камісіі ШАКАЛАЎ. Сэкратар ДРОБКУ. А. Савіцкі.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». Новы выключны нямецкі баявік паводле твору ГЭРГАРДТА ГАЎПТМАНА. „ТКАЧЫ". У гал. ролі ПАУЛЬ ВЭГЕНЭР.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Ад аўторка 2-га кастрычніка ПРЭМ'ЕРА! НЯМЕЦКІ БАЯВІК 1928 ГОДУ. „Другое жыцьцё" Трагедыя ў 8 частках. З прычыны працяжнасьці праграмы (2 гадзіны) пачатак 1-га сэансу роўна а 7 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». Ад аўторка, 2-га кастрычніка нямецкая фільма „ЖОНКА СТАТС-СЭКРАТАРА" у 8-х частках. У галоўн. ролях: вядомы нямецкі артыст ВЭРНЭР КРАУСС. 3 сэансы; пачатак 1-га сэансу а 7 гадз., 2—у 8 г. 45 м. 3—10 г. 30 м.

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». 2-гі ТЫДЗЕНЬ „Нарадзіўся чалавек". У галоўнай ролі нар. артыст МАСКВІН.

На 20 кастрычніка 1928 году ў Менску склікаецца

2-гі Усебеларускі зьезд т-ва „Прэч Няпісьменнасьць"

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЮ:

1. Справаздача Цэнтральнага Савету т-ва П.Н.
2. Справаздача Рэвкамісіі.
3. Вынікі і перспэктывы ліквідацыі няпісьменнасьці ў БССР.
4. Вытворчы плян ліквідацыі няпісьменнасьці т-ва П.Н.
5. Выбары ЦСТПН.
6. Бягучыя справы.

АРГАНІЗАЦЫЙНАЯ КАМІСІЯ.

Главлітбел 302.